Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 51 (28667)

16 САКАВІКА 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА



**Суседзі ў вялікім горадзе…**

СТАР. 5



**Ці можа пракарміць любімая справа?**

МС



**Як абараніць пенсіянераў ад махляроў?**

МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ, старшыня Магілёўскага аблвыканкама:**

*«За непрацяглы перыяд станаўлення дзяржавы наша краіна прызнана як паўнапраўны прадстаўнік сусветнай супольнасці. Мы сёння гаворым на самым высокім узроўні аб сваіх поглядах на сусветную эканоміку і палітыку, пазіцыянуем краіну на міжнароднай арэне як міралюбівую дзяржаву, якая хоча выбудоўваць адносіны з усімі на раўнапраўных умовах і не на шкоду сабе. Калі моладзь, напрыклад алімпійцы, даказвае, што мы сапраўды шмат можам, што ў сваім развіцці можам канкураваць з буйнымі дзяржавамі, гэта выклікае павагу і павышае аўтарытэт краіны. Сучасная моладзь здольная мяняць жыццё краіны да лепшага і ўносіць значны ўклад у яе развіццё».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | - 2° |
| Віцебск | - 5° |
| Гомель | - 3° |
| Гродна | -2° |
| Магілёў | - 6° |
| Мінск | - 4° |

# ВЯСНЕ — ДАРОГУ! АДРАМАНТАВАНУЮ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Работнікі дарожна-эксплуатацыйнага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Рамаўтадар» Кастрычніцкага раёна Мінска працуюць над ямачным рамонтам вуліцы Магілёўскай. Да першага мая бягучага года дарожнікам пастаўлена задача прывесці дарогі і вуліцы раёна ў належны стан.**

■ Праблема і рашэнне

## Зубры сыходзяць, трэба іх вярнуць

**Як праект «Ветландс» плануе захоўваць рэдкія віды жывёл, і навошта нам патрэбны галандскія тарпаны**

**Налібоцкая пушча — першае ў Беларусі месца, дзе ў свой час была створана папуляцыя зуброў, якія жывуць на волі (дагэтуль рэдкія жывёл трымалі ў вальерах). І калі 20 гадоў таму яна бесперапынна расла, то сёння паказчыкі нараджальнасці знізіліся да нуля. Акрамя таго, жывёлы пачалі пакідаць лясны масіў і выходзіць «у людзі». Прычын такіх змен некалькі, але асноўныя — недахоп ежы і зарастанне тэрыторый, на якіх зубры пасвяцца, упэўнены спецыялісты.**

СТАР. 4



Фота Андрэя ШЫМЧУКА.

■ Разумныя грошы

## А КРЭДЫТ МОГУЦЬ І НЕ ДАЦЬ

**Пра асаблівасці крэдытавання пенсіянераў і ўладальнікаў асабістых падсобных гаспадарак**

**Дзесьці месяц таму адзін мой знаёмы вырашыў купіць сабе нятанную машыну. Звярнуўся ў банк па грошы. А яму там адмовілі, таму што даходы ў яго ёсць, але яны не пацверджаны дакументальна. У іншым беларускім банку крэдыт усё ж такі далі, праўда, запатрабавалі багата паручыцеля...**

**Па каментарый сітуацыі мы звярнуліся ў Асацыяцыю беларускіх банкаў. Ад іх мы атрымалі падрабязны адказ на гэтае пытанне і не толькі.**

### Даходу на паперы няма — і грошай няма

Аказваецца, згодна з заканадаўствам нашымі банкамі распрацаваны і зацверджаны лакальныя нарматыўныя прававыя акты, у якіх прадугледжваюцца абавязковыя ўмовы і парадак выдзялення грашовых сродкаў і іх вяртання. Там жа прапісаны працэдура прыняцця рашэння аб выдзяленні грашовых сродкаў, парадак вызначэння праваздольнасці і ацэнкі крэдытаздольнасці патэнцыйнага крэдытаатрымальніка, а таксама пералік прадстаўляемых ім дакументаў для атрымання крэдыту да заключэння крэдытнага дагавора.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# НА ВАРЦЕ ГАЛОЎНАГА ЗАКОНА

**Гэта дзень, калі ўшаноўваюць не, як звычайна, чалавека ці падзею, а дакумент, які рэгламентуе жыццё ўсёй краіны. Дзень Канстытуцыі — нагода для таго, каб нагадаць пра дзяржаўнасць, пра нарматворчы працэс, пра законы, якія ўплываюць на кожнага грамадзяніна. Ёсць і тыя, хто стаіць, можна сказаць, на варце гэтага ключавога дакумента — суддзі Канстытуцыйнага суда. Менавіта з імі ўчора правеў сустрэчу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Без справядлівых законаў, дакладных і лагічных правілаў нельга развіваць дзяржаву, у якой на першым месцы знаходзяцца дабрабыт, прававая і сацыяльная абароненасць грамадзян. Па словах кіраўніка дзяржавы, з часам мы прыйдзем да абмеркавання пытання аб унясенні змяненняў у Канстытуцыю. «Усё вельмі проста: не трэба ў гэтым шукаць нейкія навіны, аж да фэйкавых. Трэба разумець, што заканатворчасць — гэта жывы працэс, гэта жывы арганізм, які павінен удасканальвацца, каб не адстаць ад таго жыцця, якое пульсуе наогул у свеце», — сказаў беларускі лідар. Таму Канстытуцыя павінна быць на крок ці нават на два наперадзе змяненняў у грамадстве.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што трэба вельмі дакладна і правільна выбраць момант для ўнясення змяненняў у Галоўны Закон краіны, бо нават самі размовы аб змяненні Канстытуцыі параджаюць у найлепшым выпадку броўнаўскі рух у грамадстве. «А некаторыя вельмі палітызаваныя і зацікаўленыя колы пачынаюць развіваць ужо вельмі бурную дзейнасць на гэтай аснове. Таму важна выбраць час, калі мы будзем падбірацца да карэкціроўкі гэтага закона», — заўважыў Прэзідэнт.

Выпрацоўваючы прапановы па ўдасканаленні Канстытуцыі, няма неабходнасці збіраць асобныя нарады і ствараць рабочыя групы. Галоўнае — прапанаваць канкрэтныя змяненні, бо суддзі здольныя і самі даць неабходныя фармулёўкі. «Канстытуцыйны суд павінен пра сябе гучна заявіць, і, напэўна, гэта будзе самая гучная заява за ўсё існаванне Канстытуцыйнага суда і нашай суверэннай і незалежнай краіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Кажучы пра магчымыя карэкціроўкі, Аляксандр Лукашэнка звярнуўся і да тэмы паўнавартаснай шматпартыйнай сістэмы. У прыватнасці, ужо не раз гучалі прапановы стварыць партыю на базе грамадскай арганізацыі «Белая Русь». «Я катэгарычна супраць, каб гэта была праўладная партыя, каб у ёй былі ўсе начальнікі. Ідуць такія размовы. Хтосьці кажа — час, трэба нешта зняць з улады, перадаць у партыі, трэба кадравыя пытанні вырашаць. Усё гэта правільна. А хтосьці кажа, што не час», — сказаў Прэзідэнт. Калі грамадства гатова да стварэння сапраўднай шматпартыйнай сістэмы, варта дакладна прапісаць ролю партый у Канстытуцыі. Але на цяперашнім этапе, на думку беларускага лідара, у партыях не так шмат членаў, як гэта павінна быць.

Асобнае пытанне — па прававой свядомасці беларусаў, якую трэба развіваць, вядома ж, яшчэ са школы. Асноўны акцэнт варта рабіць на выкладанні ў ВНУ, асабліва — на юрыдычных спецыяльнасцях. Як прыклад кіраўнік дзяржавы прывёў Акадэмію кіравання і падкрэсліў, што існуючая ў ёй сістэма выкладання патрабуе рэформаў, што студэнтаў важна вучыць таму, што ім сапраўды спатрэбіцца падчас іх будучай работы — пачынаючы з замежнай мовы і заканчваючы правасвядомасцю. І якраз з апошнім лепш за ўсё справяцца суддзі Канстытуцыйнага суда.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

## ■ Круглая дата

# 240 ГАДОЎ НА ТРАІХ

### Сярод раёнаў Мінска адразу тры юбіляры

**На гэтым тыдні Савецкі, Заводскі і Кастрычніцкі раёны беларускай сталіцы адзначылі 80 гадоў з дня заснавання. Адпаведную пастанову ў сувязі з хуткім ростам горада ЦВК БССР прыняў 17 сакавіка 1938 года, праўда, тады раёны насілі зусім іншыя назвы — Варашылаўскі, Сталінскі і Кагановіцкі адпаведна.**

Галоўнае святочнае мерапрыемства, прысвечанае гэтай значнай для Мінска падзеі, прайшло ў Палацы Рэспублікі. З прыгожай датай прысутных павіншаваў **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ,** ён разам з кіраўнікамі раёнаў уручыў ганаровыя ўзнагароды найлепшым работнікам арганізацый, зарэгістраваных у гэтай частцы горада. Пасля гасцей свята чакала канцэртная праграма, падчас якой вызначыліся самі кіраўнікі раёнаў — замест афіцыйнага звароту яны зачыталі вершы пра горад.

Акрамя агульнага канцэрта, шэраг святочных мерапрыемстваў запланаваны ў кожным з раёнаў. Так, у Заводскім раёне праграма прадугледжвае ўрачысты сход, адкрыццё Дошкі гонару і службы «Адно акно», а таксама масавыя гулянні ў суботу на пляцоўцы каля «Чыжоўка-Арэны» з 12 да 21. Гасцей свята чакае выстава тэхнікі, інтэрактыўная пляцоўка, канцэрт, дзяцей асабліва парадуе запуск паветраных шароў і маляўнічы феерверк.

А Савецкі раён падзяліў радасць свята з замежнымі гасцямі: у Мінск прыбылі дэлегацыі з расійскіх Екацярынбурга і Новасібірска, украінскага Кіева і польскага Любліна. Для кожнай дэлегацыі была распрацавана індывідуальная праграма, якая ўключае наведванне вядучых прадпрыемстваў, гандлёвых і сацыяльных аб'ектаў, што размешчаны ў раёне. Савецкі раён не адстае ад «калег» і ў плане культурнага жыцця. Дарэчы, сёння ў трох раёнах-юбілярах прыкладае больш за паўмільёна чалавек.

**Дар'я КАСКО**

## ПРАМАЯ СУВЯЗЬ ДЗЕЙНІЧАЕ

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 17 сакавіка ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах.**

**У гэтую суботу з 9.00 да 12.00 на сувязь з жыхарамі выйдуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч Вялічка (80162213121);

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч Белавус (80212222222);

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Андрэевіч Дворнік (80232331237);

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна Бубенчык (80152735644);

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч Пархамовіч (80222501869);

старшыня МІНСКАГА аблсавета дэпутатаў Наталля Віктараўна Якубіцкая (80175004160);

намеснік старшыні МІНГАРВЫКАНКАМА Аляксандр Пятровіч Крэпак (80172224444).

## ■ Фінансы

# ДА ЛІПЕНЯ СТАЎКІ ВЫРАШЫЛІ НЕ ЧАПАЦЬ

### Стаўка рэфінансавання захоўваецца на ўзроўні 10,5 %

**Нацыянальны банк па выніках штоквартальнага пасяджэння праўлення 14 сакавіка пакінуў без змены стаўку рэфінансавання і працэнтныя стаўкі па аперацыях рэгулявання ліквіднасці, заявілі ў прэс-службе рэгулятара.**

«Інфляцыя знаходзіцца ў межах прагнознай траекторыі», — адзначаюць у Нацбанку. У лютым 2018 года прырост спажывецкіх цэн у гадавым вымярэнні склаў 4,9 %. У наступныя месяцы чакаецца захаванне інфляцыі ў гадавым вымярэнні каля 5 %. «Эканамічная актыўнасць працягвае аднаўляцца. Дэзінфляцыйны ўплыў з боку фактараў попыту памяншаецца перш за ўсё за кошт апераджальнага росту заробкаў над ростам прадукцыйнасці працы», — падкрэсліваюць у галоўным банку краіны, адзначаючы таксама захаванне высокіх інфляцыйных чаканняў эканамічных суб'ектаў. «Іх узровень перавышае мэтавы параметр па інфляцыі», — прызнаюць эксперты банка.

Спецыялісты таксама адзначаюць, што ў пачатку гэтага года назіраецца прагназаванае паскарэнне тэмпаў росту сярэдняй шырокай грашовай масы — да 18,4 % у гадавым вымярэнні ў лютым. «Такім чынам, рашэнне аб захаванні працэнтных ставак адлюстроўвае мэтазгоднасць падтрымання нейтральнасці грашова-крэдытных умоў», — гаворыцца ў паведамленні.

Наступнае штоквартальнае пасяджэнне праўлення Нацыянальнага банка па грашова-крэдытнай палітыцы адбудзецца 20 чэрвеня.

**Сяргей КУРКАЧ**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

| |
|---|
| **Продавец:** ОАО «Витебский плодоовощной комбинат», 211301, Республика Беларусь, Витебская район, аг. Новка, ул. Рудаковская, д. 9 |
| Наименование предмета торгов, начальная цена с учетом НДС, задаток |
| Лот № 1. Легковой автомобиль Фольксваген Пассат В6, 2010 г. в., гос. номер 2334 ЕХ-2. Начальная цена: 17 880 руб. Задаток: 1788 руб. |
| Лот № 2. Трактор Беларус 920.2, 2011 г. в., гос. номер ВВ-2 2631, с погрузчиком. Начальная цена: 21 360 руб. Задаток: 2 136 руб. |
| Лот № 3. Трактор Беларус МТЗ 82.1 (щетка), 1994 г. в., гос. номер 4222 БЯ. Начальная цена: 9360 руб. Задаток: 936 руб. |
| Лот № 4. Грузопассажирский вагон ГАЗ 2705-435, 2006 г. в., гос. номер АА 3381-2. Начальная цена: 4560 руб. Задаток: 456 руб. |
| Лот № 5. Грузовой фургон изотермический ГАЗ 377030, 2006 г. в., гос. номер АА 3576-2. Начальная цена: 5400 руб. Задаток: 540 руб. |
| Лот № 6. Погрузчик НС CPCD30HBW13. Начальная цена: 10 800 руб. Задаток: 1 080 руб. |
| Торги состоятся 18.04.2018 в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, Витебская район, аг. Новка, ул. Рудаковская, д.9 в ОАО «Витебский плодоовощной комбинат». Срок внесения задатка и подачи заявлений: с 16.03.2018 с 8.30 по 14.04.2018 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с BY41BELB30121214480040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, пр-т Победителей, 29, BIC BELBBY2X, УНП 300063727. Получатель платежа: ОАО «Витебский плодоовощной комбинат». Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. Начальная цена указана с учетом НДС |

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Имущество, выставляемое на торги бывшее в употреблении. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by


# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗАБОЙСТВА ЖУРНАЛІСТА ВЫКЛІКАЛА Ў СЛАВАКІІ ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС

Аб гэтым паведаміў тэлеканал Euronews. Як вядома, напрыканцы лютага ў Славакіі быў знойдзены мёртвым 27-гадовы журналіст Ян Кучак, які займаўся антыкарупцыйнымі расследаваннямі. Яго апошні незавершаны артыкул называўся «Італьянская мафія ў Славакіі: яе шчупальцы дацягнуліся да палітыкі». У Страсбургу Еўрапарламент ушанаваў памяць Кучака і абмеркаваў меры па абароне работнікаў СМІ. У Браціславе ў мінулыя выхадныя прайшла самая буйная дэманстрацыя пасля падзення камуністычнага рэжыму. Яе ўдзельнікі патрабавалі выгнання замежных злачынных груповак і выказвалі адабрэнне журналісцкіх расследаванняў. Славакія змешчана пад асаблівае назіранне галоўных устаноў Еўрасаюза. У сераду прэм'ер-міністр Роберт Фіца заявіў пра гатоўнасць пакінуць сваю пасаду. Раней сышоў у адстаўку кіраўнік МУС Роберт Каліняк.

### САМАЛЁТ У ЯКУЦКУ РАЗГУБІЎ ЗЛІТКІ СРЭБРА



Аэрапорт Якуцка паведамляе, што з транспартнага самалёта Ан-12 пры вылеце з горада вываліўся «асаблівa каштоўны груз». Мясцовыя СМІ апублікавалі фатаграфіі зліткаў, рассыпаных па ўзлётнай паласе. Першапачаткова паведамлялася, што рассыпалася золата; пазней крыніца Інтэрфакса ўдакладніла, што самалёт перавозіў не золата, а срэбра. «Усяго каля 200 зліткаў каштоўнага металу. Частка грузу аказалася на ўзлётна-пасадачнай паласе», — сказаў суразмоўца агенцтва. У паведамленні Следчага камітэта, які расследуе інцыдэнт, названы «каштоўны метал у злітках вагой каля 9,3 тоны». Па звестках ведамства, груз належыць Чукоцкай горна-геалагічнай кампаніі.

### YOUTUBE ЎЗМОЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ З РАЗМЯШЧЭННЕМ НЕДАКЛАДНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Пра гэта паведаміла агенцтва The Associated Press. Паводле яго звестак, гендырэктар YouTube Сюзан Вojджыцкі, выступаючы на адной з тэхналагічных канферэнцый у ЗША, заявіла, што сэрвіс будзе больш старанна спыняць спробы размяшчэння на ім дэзінфармацыі. Гаворка ідзе ў тым ліку аб відэазапісах, аўтары якіх распаўсюджваюць розныя тэорыі змовы і міфы. У якасці прыкладу яна прывяла ролікі, якія змяшчаюць ілжывыя звесткі аб тым, што Зямля насамрэч нібыта плоская, а таксама што масавыя расстрэлы ў амерыканскіх школах з'яўляюцца быццам бы пастановачнымі.

### ФІНЫ — САМЫЯ ШЧАСЛІВЫЯ




Згодна са штогадовым дакладам AAH World Happiness Report-2018, Фінляндыя — самая шчаслівая краіна ў свеце. Бyў прааналізаваны цэлы шэраг паказчыкаў: дабрабыт, працяглaсць жыцця, сацпадтрымка, узровень карупцыі, нарэшце, ступень асабістай свабоды ў 156 краінах. Акрамя таго, асобна ў 117 з іх ацэнены ўзровень дабрабыту і шчасця мігрантаў. Следам за Фінляндыяй размясціліся Нарвегія, Данія і Ісландыя. Характэрна, што апошнія некалькі гадоў гэтыя дзяржавы Паўночнай Еўропы ўтрымліваюць лідарства ў рэйтынгу. З неўрапейскіх краін у топ-10 трапілі Канада, Новая Зеландыя і Аўстралія.

■ Надвор'е

# «ЗАМАРОЖАНАЯ» ВЯСНА

### У ноч на нядзелю сіноптыкі чакаюць у асобных раёнах да 19 марозу

**Пасля даволі цёплага надвор'я, якое ўтрымлівалася на гэтым тыдні, да нас зноў вяртаюцца маразы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам перыферыі скандынаўскага антыцыклону, а з поўночнымі вятрамі да нас накіруецца халоднае паветра з поўначы Еўропы. Будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём па поўдні краіны пройдзе невялікі снег. У сярэдзіне дня рэзка пахаладае, на дарогах утворыцца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе не вышэй чым мінус 1 — мінус 7 градусаў. У выходныя дні ўмовы надвор'я будзе ў асноўным вызначаць халодны антыцыклон, толькі ў суботу ў паўднёвых раёнах адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Чакаецца далейшае ўзмацненне маразоў.

**У суботу ўначы пераважна па паўднёвай палове краіны, удзень у асноўным па Гомельскай і Магілёўскай абласцях чакаецца снег, месцамі — моцны снег.**

У суботу ўначы пераважна па паўднёвай палове краіны, удзень у асноўным па Гомельскай і Магілёўскай абласцях чакаецца снег, месцамі — моцны снег, завіруха. У гэтых рэгіёнах дыскамфорту дабавіць моцны парывісты вецер. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы знізіцца да 7—13 марозу, па паўночным усходзе краіны прагназуецца ад мінус 14 да мінус 17 градусаў. Халодна будзе і ўдзень — 3—9 марозу. Захаваецца халоднае надвор'е і ў нядзелю. Будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 11 да мінус 17 градусаў, у асобных раёнах яна панізіцца да мінус 18 — мінус 19 градусаў. Удзень у другой палове дня пры невялікай воблачнасці будзе ад нуля да мінус 6 градусаў.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у панядзелак у асобных раёнах Беларусі пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень чакаецца ад мінус 4 да 3 градусаў цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ЗНЯЛІ ПАГРОЗУ ПАНТОНУ

### У Жыткавіцкім раёне аператыўна ліквідавана пагроза пантоннай пераправе

Увечары пры маніторынгу аператыўнай абстаноўкі на Прыпяці інжынерам аддзела пантонна-мастаявой службы МНС была заўважана крыга шырынёй 200 метраў і даўжынёй 700 метраў. Глыба лёду павольна рухалася ў бок пантоннай пераправы, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.



Фота БЕЛТА.

Быў абвешчаны збор і дастаўка да месца пераправы работнікаў Пінскага цэнтра Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння на чале з начальнікам аддзела пантонна-мастаявой службы падраздзялення. Былі праведзены арганізацыйныя мерапрыемствы па ўтрыманні пераправы —прыведзены ў гатоўнасць два катары і ледакол. Плаўсродкі былі ўстаноўлены каля левага і правага берагоў ракі супраць цячэння. Да месца выкліку былі накіраваны экскаватары прадпрыемства «Днепрабугскі водны шлях». Калі пачаўся рух лёду ў бок моста, па ім быў перакрыты рух транспарту. З двух бакоў спецыялісты прыступілі да раскалвання крыг і пропуску іх праз пантон. У выніку сумеснай аперацыі па папярэджанні надзвычайнай сітуацыі пантонная пераправа працягвае працаваць у штатным рэжыме. Усе работы праведзены без развядзення моста.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ На слыху

# РЭГУЛЯРНЫЯ ЗНОСІНЫ НАЛАДЖВАЮЦЦА



### Перавозчыкі падаюць адпаведныя заявы

**Для аператыўнага рэагавання на транспартнае забеспячэнне насельніцтва аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам, арганізацыямі аўтамабільнага і гарадскога электрычнага транспарту прымаюцца меры (асабліва ў святочныя і выхадныя дні) па планаванні транспартных сродкаў і вадзіцельскага складу, уключаючы рэзерв, для бесперабойнага выканання перавозак пасажыраў, паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый.**

Пры гэтым асаблівая ўвага звяртаецца на гарантаванне бяспекі перавозак пасажыраў, арганізацыю маніторынгу найбольш запатрабаваных кірункаў і прыняцце ўсіх неабходных мер па недапушчэнні зрываў рэйсаў пры выкананні гарадскіх, прыгарадных і міжгародніх аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах.

Ад перавозчыкаў, якія раней выконвалі аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у нерэгулярных зносінах, у адрас мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і аператараў аўтамабільных перавозак пасажыраў у перыяд з 26 лютага па 13 сакавіка паступіла 135 заяў на атрыманне часовага права (да правядзення конкурсаў па пэўных маршрутах) на выкананне міжгародніх перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах. З іх па 23 заявах заключаны адпаведныя дагаворы аб арганізацыі аўтамабільных перавозак пасажыраў па такіх найбольш запатрабаваных напрамках, як Слуцк, Салігорск, Старыя Дарогі, Капыль, Полацк, Наваполацк, Гродна, Ліда і іншыя.

У цяперашні час больш за 1,2 тысячы перавозчыкаў прыватнай формы ўласнасці выконваюць аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах, з якіх 137 — у міжгароднім кірунку.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# КАБ РЫБАМ ДЫХАЛАСЯ ЛЯГЧЭЙ

**Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў эколагаў, ці трэба верыць чуткам пра пагрозу для рыбы з-за эксплуатацыі Віцебскай ГРЭС на Заходняй Дзвіне.**

### Водны рэкардсмен

— Паўночны рэгіён найбольш забяспечаны воднымі рэсурсамі. Тут працякаюць дзве вялікія трансгранічныя ракі — Заходняя Дзвіна і Днепр, а таксама каля 600 сярэдніх і малых рэк агульнай працягласцю каля 9 тысяч кіламетраў.

Азёр у нас каля дзвюх тысяч. Іх агульная плошча больш за 900 квадратных кіламетраў. Агульны аб'ём вады — каля 3,2 мільёна кубічных метраў, — расказаў **Пётр ДУК, намеснік старшыні Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Самыя буйныя азёры — Асвейскае, плошчай 52,6 км² (другое месца ў краіне пасля Нарачы), Лукомскае (36,6 км²), Дрывяты (36,1 км²). У Браслаўскім і Ушацкім раёнах вялікая колькасць розных па велічыні і глыбіні азёр утвараюць разгалінаваныя азёрныя сістэмы. Браслаўская ўключае ў сябе 31 возера, Ушацкая — 60.

### Дзе бываюць заморы?

Мінулай зімой у Віцебскай вобласці не было зарэгістравана рыбных замораў.

— Заморныя з'явы адбываюцца ў плыткіх бясцёкавых або слабапраточных азёрах. Па сутнасці, рыба гіне масава, калі ў вадзе не хапае кіслароду. На зімовы перыяд 2017—2018 гадоў вызначана 40 вадаёмаў, на якіх праведзены лабараторныя даследаванні. Праводзяцца таксама аб'езд вадаёмаў і апытанне мясцовых жыхароў, — тлумачыць **галоўны спецыяліст аддзела камітэта Генадзь ГАРЛАНАЎ.**

Каб не дапусціць замораў, ажыццяўляюцца розныя мерапрыемствы. Напрыклад, робяць аэрацыю вады — механічную або паветраную. Добра апраўдваюць сабе і «дзедаўскія метады»: уладкаванне палонак, лунак. Нядаўна лункі зрабілі на возеры Дыманоўскім у Віцебскім раёне. Працэс просты, адпрацаваны вякамі.

Цікава, што больш цяжка папярэджваць летнія заморы. Пры высокай тэмпературы паветра вадаёмы мялеюць, падводныя расліны, пясок, камяні ператвараюцца ў «кашу», пад якой гіне рыба. Напампоўваць ваду, задзейнічаць тэхніку, каб пашырыць водную прастору, — вельмі дорага. Выкарыстоўваюць і вапнаванне. Унясенне вапны спрыяе паляпшэнню кіслароднага рэжыму і паскарае працэс фотасінтэзу водарасцяў.



Прафілактыка замору на возеры Дыманоўскім у Віцебскім раёне.

### Шкодная пена?

Пасля ўвядзення ў эксплуатацыю Віцебскай ГРЭС на хвалях Заходняй Дзвіны можна ўбачыць пену. Скептыкі сцвярджаюць, што гэта — вынік парушэнняў умоў эксплуатацыі станцыі.

Эколагі супакоілі. Пена атрымліваецца з-за таго, што вада праходзіць праз турбіны. Чуткі пра зліў нафты ў раёне ГРЭС не маюць пад сабой нічога блізкага да рэчаіснасці. Наадварот, узровень вады ў адной з самых вялікіх рэк Еўропы дзякуючы станцыі павысіўся. У яе акваторыі прадугледжваецца стварэнне зоны для адпачынку і воднага турызму...

У інтэрнэце абмяркоўвалася і пагроза для вадаёмаў Беларусі з-за будаўніцтва на Пскоўшчыне больш як 30 свінакомплексаў, кожны не менш, чым на 24 тысячы свінак.

Як канстатавалі ў камітэце, насамрэч яны небяспечныя для некалькіх прытокаў буйных беларускіх рэк прыгранічча. Забруджвання басейна ракі Заходняя Дзвіна не выяўлена.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ У рэгіёне

# ГУЛЬНІ БЕЗ ДЫМУ

### Запалкі спартыўныя, лагічныя і творчыя

**Калодзеж і цягнік з запалак, карабель з пачка і іншыя конкурсы на хуткасць, логіку і крэатыўнасць па выкарыстанні «чыркалак». Такія забавы прапанавалі дзецям замест звычайнай лекцыі па бяспецы падчас «Запалкавага турніру», які прайшоў днямі ў гарадскім пасёлку Карэлічы Гродзенскай вобласці.**

— Прымеркаванае да Міжнароднага дня запалкі і прафілактыкі дзіцячага траўматызму мерапрыемства мела на мэце паказаць школьнікам, што запалкі — гэта не толькі небяспека, але і карысны атрыбут штодзённага жыцця, — расказала **Аксана БАСЮК, загадчык аддзела метадычнай працы Карэліцкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці.** — Дзеці самі разважалі, што запалкі могуць і прынесці бяду з пажарам, і дапамагчы запаліць агонь для цяпла і гатавання ежы.



Арганізатары зладзілі сапраўдную спартакіяду. Малыя на хуткасць пераносілі пачкі на галаве, плячах і кулаку. На хуткасць будавалі з запалак самы высокі калодзеж і самы доўгі цягнік. Прычым «вагоны» павінны былі мець па два колы і прычапную прыладу паміж сабой.

Прадстаўнік раённай арганізацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях расказала дзецям пра небяспеку гульняў з агнём і запалкамі. А роставая лялька — пачак з запалкамі, — зробленая супрацоўнікамі цэнтра, дапамагала ўсім удзельнікам.

**Ірына СІДАРОК**

# А КРЭДЫТ МОГУЦЬ І НЕ ДАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым замацаваныя нормы накіраваны на забеспячэнне прымальнага для банка ўзроўню крэдытнай рызыкі. Па крэдытных прадуктах для фізічных асоб адным з устаноўленых большасцю банкаў крытэрыяў прымальнасці з'яўляецца наяўнасць у заяўніка (паручыцеля) пастаяннай крыніцы даходу на тэрыторыі краіны.

Пры адсутнасці ў заяўніка такой крыніцы, нават калі ён і атрымлівае даходы з-за межаў дзяржавы, у банкаў адсутнічае магчымасць праверкі інфармацыі аб статусе працоўных адносін і аб афіцыйным працаўладкаванні заяўніка. Акрамя таго, спецыялістам банка ў гэтым выпадку немагчыма праверыць звесткі, указаныя ў дакуменце аб даходах заяўніка, атрымаць інфармацыю пра падаўжэнне кантракта, а таксама характарыстыку кліента. Фінансавы інстытут не зможа праверыць юрыдычны статус арганізацыі — работадаўцы: ці з'яўляецца арганізацыя дзеючай (не на стадыі ліквідацыі), ці няма фінансавых цяжкасцяў і іншых магчымых негатыўных фактараў, што могуць паўплываць на плацежаздольнасць прэтэндэнта на крэдыт.

Акрамя гэтага пры невыкананні абавязацельстваў па вяртанні крэдыту даўжніком, які не мае даходаў на радзіме, могуць узнікнуць цяжкасці пры ажыццяўленні выканання рашэнняў судоў (натарыусаў) Беларусі на тэрыторыях замежных дзяржаў.

## Усё на плечы паручыцеля?

У выпадку, калі кліент не мае пастаяннай крыніцы даходу тут, але мае яе за межамі краіны, магчымым варыянтам для атрымання ім крэдыту ў айчынным банку можа стаць падача паручыцельства плацежаздольнага грамадзяніна. Гэты паручыцель павінен пастаянна пражываць у Беларусі і мець пастаянную крыніцу даходу па асноўным месцы працы на тэрыторыі краіны. Акрамя таго, прававыя акты асобных банкаў прадугледжваюць разгляд заявак на атрыманне крэдыту кліентамі, якія атрымліваюць прыбытак ад працоўнай дзейнасці ад арганізацый, зарэгістраваных па-за межамі краіны.




**Даходаў заяўніка павінна быць дастаткова не толькі для пагашэння доўгу па крэдыце і выплаты працэнтаў за яго выкарыстанне, але і для забеспячэння іншых выдаткаў на суму не менш за бюджэт пражытачнага мінімуму для працаздольнага насельніцтва.**

У гэтым выпадку крэдыт дадуць пры ўмове падачы даведкі аб даходах, а таксама копіі дакумента, які пацвярджае працаўладкаванне фізічнай асобы (працоўны дагавор, кантракт або працоўная кніжка). У выпадку афармлення гэтых дакументаў на замежнай мове патрабуецца суправаджальны дакумент, які змяшчае натарыяльны пераклад.

Яшчэ адзін варыянт — афармленне карты растэрмінаўкі, пры якой да пэўнай сумы падаваць дакумент, які пацвярджае атрыманне даходу, не патрабуецца.

## Вялікую суму пад пенсію не дадуць

Асацыяцыя беларускіх банкаў сумесна з банкамі разгледзела электронныя звароты грамадзян, якія паступілі на адрас Нацыянальнага банка. А былі гэта скаргі на дзеянні банкаў у сувязі з іх адмовай улічваць пры ацэнцы крэдытаздольнасці заяўніка асобныя віды даходаў (дапамогі, пенсіі, страхавыя выплаты), а таксама сродкі, якія паступаюць у межах дагавораў падраду (платнага аказання паслуг).

У адпаведнасці з заканадаўствам банкі маюць права самастойна вызначаць прымальныя для іх рызыкі, у прыватнасці, пералік крыніц даходаў фізічных асоб, якія ўлічваюцца пры разліку крэдытаздольнасці. Пералічаныя вышэй віды даходаў разглядаюцца большасцю банкаў толькі ў якасці дадатковых крыніц. Чаму?

На думку банкаў, форма найму па дагаворы падраду не гарантуе пастаянства працаўладкавання. Работа, якая ажыццяўляецца ў рамках дагавораў падраду (платнага аказання паслуг), як правіла, носіць часовы характар. Для банкаў жа адзін з найважнейшых крытэрыяў пры ацэнцы крэдытаздольнасці — рэгулярнасць паступлення даходаў у крэдытаатрымальніка на працягу ўсяго перыяду выкарыстання крэдыту.

У дачыненні да ўліку пры ацэнцы крэдытаздольнасці розных відаў дапамог, пенсій, страхавых выплат банкамі выказана меркаванне, што гэтыя сродкі маюць мэтавае прызначэнне і іх уключэнне ў разлік плацежаздольнасці заяўніка на атрыманне крэдыту, а ў далейшым выкарыстанне ў якасці крыніцы пагашэння запазычанасці па крэдыце можа прывесці да пагаршэння якасці жыцця кліента.

Як правіла, падыходы, якія прымяняюцца банкамі да ацэнкі крэдытаздольнасці, накіраваны на недапушчэнне празмернай крэдытнай нагрузкі на крэдытаатрымальніка. Даходаў заяўніка павінна быць дастаткова не толькі для пагашэння доўгу па крэдыце і выплаты працэнтаў за яго выкарыстанне, але і для забеспячэння іншых выдаткаў на суму не менш за бюджэт пражытачнага мінімуму для працаздольнага насельніцтва.

## Прыватная гаспадарка — даходы сезоннага характару

Акрамя таго, Асацыяцыя беларускіх банкаў сумесна з банкамі разгледзела пытанні, звязаныя з адмовай у выдачы крэдыту грамадзянам — уладальнікам асабістых падсобных гаспадарак без падачы даведкі аб даходах.

На думку банкаў, наяўнасць у заяўніка пастаяннай крыніцы даходу ў выглядзе рэгулярных выплат, а не факт наяўнасці даведкі аб даходах, з'яўляецца асноўным крытэрыем пры прыняцці рашэння аб магчымасці выдзялення крэдыту кліенту.

**Паступленне даходаў пры вядзенні асабістай падсобнай гаспадаркі носіць сезонны характар і спалучана з рызыкай негатыўнага ўплыву прыродных фактараў.**

Варта адзначыць, што змяненне банкаўскага заканадаўства, у выніку якога банкі атрымалі магчымасць выдаваць асобныя віды крэдытаў на спажывецкія мэты без падачы заяўнікамі даведак аб даходах, не мяняе ў корані падыходы банкаў да ацэнкі крэдытаздольнасці. Усё роўна заяўнік павінен мець крыніцы даходаў, якія прызнаюцца ў адпаведнасці з лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі банка, прымальнымі як якасна, так і колькасна.

Паступленне даходаў пры вядзенні прыватнай падсобнай гаспадаркі, як правіла, носіць сезонны характар і спалучана з рызыкай негатыўнага ўплыву прыродных фактараў — дождж ці засуха могуць пашкодзіць ураджай, з якога чалавек меркаваў атрымаць той самы даход. У сувязі з гэтым банкі лічаць, што ўлік даходу, які атрымліваецца фізічнай асобай пры вядзенні асабістай дапаможнай гаспадаркі, у якасці асноўнай крыніцы пры ацэнцы крэдытаздольнасці заяўніка павышае ўзровень крэдытнай рызыкі. Разам з тым даходы ад вядзення прыватнай падсобнай гаспадаркі могуць разглядацца ў якасці дадатковых пры наяўнасці ў заяўніка іншага пастаяннага даходу.

Зрэшты, перш чым звяртацца па крэдыт, варта мець на ўвазе, што выдзяленне крэдыту канкрэтнаму заяўніку з'яўляецца правам банка, а не абавязкам.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Зубры сыходзяць...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вырашыць праблемы павінен пяцігадовы праект «Устойлівае кіраванне ляснымі і водна-балотнымі экасістэмамі для дасягнення шматмэтавых пераваг» («Ветландс»), які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

— Наша задача — захаваць і аднавіць месцапражыванні раслін і жывёл, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, а таксама палепшыць кармавую ўгоддзі для вольна жывучай налібоцкай мікрапапуляцыі зуброў, — адзначае **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Сёння там 200 га тэрыторыі знаходзіцца ў дэструктыўным стане. Зубры сыходзяць, трэба іх вярнуць.

Для гэтага плануецца стварыць канвеер, які забяспечыць жывёл зялёнымі кармамі з ранняй вясны да позняй восені, а таксама ацаніць генетычны патэнцыял зуброў і, па магчымасці, аздаравіць папуляцыю.

— Зубра можна назваць лясной каровай. А ў беларускіх лясах амаль не засталося адкрытых участкаў з зялёнай раслiннасцю, якія б не зараслі хмызнякамі. Зарасла і вада. Мы плануем расчысціць каля 300 га і пракантраляваць, каб гэтыя мерапрыемствы праводзіліся рэгулярна, — падкрэсліў **загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва і суправаджэння прыродаахоўных канвенцый НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі, навуковы каардынатар праекта Аляксандр КАЗУЛІН.**


Турападобная карова.

Па словах спецыяліста, у рамках праекта таксама будзе працягнута дзейнасць па выдаленні раслінасці з нізінных балот і пойменных лугоў, у тым ліку на тэрыторыі заказнікаў «Спораўскі» і «Званец», якая была распачата яшчэ падчас праекта «Кліма-Іст». Вядома, без увагі не застанецца і Тураўскі луг — унікальная тэрыторыя, праз якую пралягаюць міграцыйныя шляхі соцень тысяч птушак, у тым ліку і рэдкіх.

— На працягу 20 гадоў мы маніторым колькасць птушак на пойменных лугах. І з кожным годам іх становіцца ўсё менш. Так, амаль у два разы скарацілася колькасць кулікоў, практычна зніклі марадункі і кнігаўкі (а гэта не глабальна пагражаемы від), — падкрэсліла **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі НПЦ па біярэсурсах Наталля КАРЛІЁНАВА.** — Безумоўна, прынятыя меры, напрыклад, кіруемае выпальванне сухой раслiннасці, паляпшаюць сітуацыю, але без комплекснага падыходу станоўчы эфект доўга не працягнецца. Вось не стала ў прыватных гаспадарках кароў, перасталі мясцовыя жыхары пасвіць жывёл на пойменным лузе — і ён зарос.

Дарэчы, свойскім жывёлам, своеасаблівым «санітарам» лугоў, якіх сёння ў многіх месцах для выканання гэтай місіі не хапае, у праекце «Ветландс» прадугледжана цікавая альтэрнатыва. Аляксандр Казулін расказаў, што ў хуткім часе ў Беларусі могуць з'явіцца вольна жывучыя тарпаны і турападобныя каровы. Жывёл планецца прывезці з Галандыі, дзе іх паспяхова разводзяць ужо на працягу некалькіх гадоў. Так што хутка ў нашых зуброў з'явіцца цікавая кампанія.

**Кацярына ЦІТОВА.**


Тарпан.

## Як змагацца з баршчэўнікам?

### Цяпер ёсць памятка Мінпрыроды

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя распрацавала памятку па правядзенні мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніка Сасноўскага.**

Гэта зроблена ў мэтах захавання і аднаўлення зямельных рэсурсаў, папярэджання выбыцця з абароту высокапрадукцыйных зямель, сельскагаспадарчых і лясных угоддзяў, ліквідацыі месцаў, дзе расце баршчэўнік Сасноўскага. Брашура змяшчае асноўную інфармацыю пра біялагічныя асаблівасці гэтай расліны, арэол яе распаўсюджвання і ўплыў на навакольную флору і арганізм чалавека, прававое рэгуляванне, спосабы барацьбы, меры бяспекі пры правядзенні мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніка Сасноўскага і іншае.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Шчупакоў у нераст лавіць нельга

**Супрацоўнікі Бярозаўскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету затрымалі 39-гадовага вяскоўца, які лавіў рыбу ў вадаёме каля вёскі Пескі.**

Грамадзянін здабыў 173 шчупакі і 10 плотак. Вага ўлову склала 7 кілаграмаў. Гэта значыць, рыбкі былі зусім маленькія, у сярэднім каля 40 грамаў кожная. А маглі б вырасці, — на тое і забарона падчас нерасту.

Шкода ж прыродзе налічваецца па колькасці здабытых экзэмпляраў. І паколькі сума шкоды перавысіла 38 тысяч рублёў, гэта значыць, нашмат большая, чым 100 базавых велічынь, гаворка ідзе аб крымінальнай адказнасці непрацуючага грамадзяніна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Сяргей РАСОЛЬКА.**




## БЫЎ ВЫБУХ, АЛЕ НЕ САЛЮТ

...З вёскі дамоў, у горад, Вера прыехала трохі раней — не дакапала бульбу, бо нідзе ж яна не дзенецца — пачакае, а вось свята — не.

Лізе, Верынай дачцэ, спаўнялася 20. Круглая дата. Дзяўчына хацела адзначыць, збірала гасцей. І хто, як не маці, павінен быў тут падключыцца — дапамагчы ёй купіць усё неабходнае, прыгатаваць на стол...

Вечарам за ім сабраліся Лізіны стрыечныя браты, сябры, сяброўкі. Сядзелі шумна, весела, бо імянінніца разам з матуляй, апроч рознай смакаты, падрыхтавалі яшчэ і конкурсы, гульні, забаўкі, танцы...

Надурэліся, карацей, насмяяліся. У «праграме» свята заставалася хіба самае кранальнае: матулі — вынесці торт, імянінніцы — загадаць жаданне ды задзьмуць на торце свечкі. Госці зноў паселі за стол.

Пуставала толькі крэсла Максіма — аднаго з запрошаных хлопцаў. Ён, падобна, затрымліваўся (прабачце, у прыбіральні), кампанія сцішана чакала. І не столькі яго вяртання, колькі таго, што вось зараз жа ў пакоі патухне святло, у дзвярах з'явіцца... торт са свечкамі, пачнецца чаяпіцце.

...Выбух (?!) у гэтай цішыні быў настолькі гучны і нечаканы, што ўсе разгубіліся, знямелі.

Толькі праз імгненні Вера з Лізай (а госці следам) кінуліся на гук і ўжо там усё зразумелі...

Плітку для абліцоўкі сцен было тады не дастаць, не купіць, але ж Веры неяк пашчасціла. У выніку сцены ў прыбіральні атрымаліся настолькі прыгожымі, што, здавалася, грэх свідраваць там нейкія дзіркі — прыладжваць «вяшак» для туалетнай паперы... Яны для гэтага іншую «канструкцыю» прыдумалі: да трохлітроўка з фарбай, які стаяў на самаробнай палічцы над бачком (а самі бачкі ў той час віселі ледзь не пад столлю) прывязалі прыгожую вяровачку, на яе падчапілі паперу...

І ўсё б нічога, калі б яна, тая вяровачка, не звісала ў найбліжэйшым суседстве са шнурком для зліву і калі б той госць, Максім, іх не пераблытаў...

Пасля гэтага слоік з фарбай і грымнуў. Прычым не проста на падлогу: ён грымнуў на... унітаз... Разбіўся сам. Разбіў незаменную ў доме пасудзіну.

Што было рабіць гаспадыні? Ну, вядома ж, прыбіраць друз і фарбу, праветрываць памяшканне. Вера, што называецца, закасала рукавы.

Імянінніца з гасцямі пайшла на вуліцу.

Свята скончылася. І праз гады, магчыма, забылася б, калі б не гэты нечаканы... «салют».

**Таццяна Чэкед,**
*г. Гомель.*

## СВАЯ РУЧКА НЕ СУЧКА

Пры слове «пікнік», мусіць, многія прыгадаюць прыгожыя сцэны з кінафільма «Масква слязам не верыць»: мужчыны (у тым ліку «Гога, ён жа Гоша, ён жа Юрый, ён жа Жора») смажаць шашлыкі, жанчыны — адпачываюць, побач бегае сабака... Потым — віно, задушэўныя размовы, песні пад гітару. І ўсё, заўважце, сумеснае, бо той, хто ў адзіночку нешта п'е, той калектыўне прызнае.

...Адзін з іх, вось такіх — чыста мужчынскіх, досыць рэгулярна (хоць і стыхійна) збіраўся ў гаражах. Пачыналася ўсё з таго, што ў некага зламалася машына, і для таго, каб яе папраўляць, трэба з адным суседам параіцца, у другога — пазычыць інструмент альбо запчасткі, у трэцяга — папрасіць дапамогі. А потым, калі справа зробіцца, ну вядома ж, разам пасядзець, узяць па «кроплі».

Згаджаліся на гэта ўсе, апроч Руслана. Што здзіўляла, чалавек ён не фанабэрысты, нават кампанейскі: з ахвотай браўся дапамагчы (і толк у аўтасправе ведаў), мог свежы анекдот расказаць і з усімі пасмяяцца... А вось каб скінуцца ды разам выпіць — не, ніколі. «Давайце без мяне», — казаў суседзям па гаражы.

І хлопцы, вядома ж, «давалі» (ці «паддавалі»?) — калі менш, калі больш, пасля чаго нехта абавязкова казаў, што Руслан іх усё-ткі «не паважае», бо калі б паважаў, то хоць зрэдку, але ж далучаўся б!

— А хочаце, — заікнуўся неяк таксіст Алёша, — я яго «далучу»?

— Ага, як маленькага за руку прывядзеш і во тут пасадзіш, — не паверылі мужчыны.

— І пасаджу! — пайшоў у заклад хлопец. — Дайце мне месяц часу.

— Ды хоць два, — «раскашэліўся» нехта з кампаніі.

І яны сталі чакаць. Як і раней, па выхадных збіраліся ў гаражах, як і раней, збіралі рублі на выпіўку.

— Хлопцы, вазьміце і мае, — прапанаваў аднойчы... Руслан.

Мужчыны — аслупянелі, але ж грошы ўзялі...

А потым — пілі і не п'янелі: з цікавасцю пазіралі то ў бок Аляксея («Няўжо перавыхаваў? Але як?»), то ў бок Руслана («Дзе гэта хто здох? Чаму ты раптам з намі?»).

Не вытрывалі: пасля трэцяй чаркі спыталі. Руслан тады выцягнуў з кішэні мясцовую рэкламную газету і рашуча прамовіў:

— Калі б ведаў, хто аб'яву падаў, — прыдушыў бы!

— А што там? — зацікавіліся хлопцы.

— Ды наце, пачытайце... Вось тут, — пальцам паказаў Руслан і аддаў газету застольнікам.

— «Прыму ў кампанію, — уголас зачытаў першы, — моцнага здаровага мужчыну (можна двух) для дыскусій на розныя тэмы. Выпіўка з закускай гарантуюцца. Нумар тэлефона...»

— Ад званкоў — адбою не было! — скардзіўся тым часам Руслан. — Аднаго, прабачце, пашлю (скажу, што не даваў ніякіх аб'яў!), другі тэлефануе... І ўсе здаровыя... А ўжо якія «падкаваныя»! Асобныя — адразу ў дыскусіі: то «Крым наш альбо не наш», то «ў чым памылка Абамы»... Прыйшлося нумар тэлефона змяніць. Ведаць бы, з-за каго...

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 19 марта по 4 апреля 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный подавший заявление на участие в аукционе в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, 74 20 95 официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by, раздел «Аукционы».**

Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» уведомляет, что в информацию о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднопромтехника» **27 марта 2018 года** внесены изменения: в строке «Начальная цена продажи» следует читать – **1 659 836,23 рубля** (с учетом НДС 20 %), в строке «Сумма задатка» следует читать **165 983,63 рубля.** Подробная информация на официальном сайте www.grodno.gov.by.

УНП 590727594

КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что **10 апреля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1** состоится **повторный аукцион** по продаже имущества **открытого акционерного общества «Гроднорайагросервис»:**

комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 3 капитальных строения (административное здание, кафе-бар, здание гостиницы), канализационную (фекальную) сеть, канализационную (ливневую) сеть, асфальтобетонное покрытие, ограждения, расположенного по адресу: **Гродненская область, Гродненский район, Обуховский с/с, д. Котра** на земельных участках с кадастровыми номерами 422086003101000107 площадью 0,2674 га и 422086003101000108 площадью 0,5114 га.

Начальная цена продажи **105 975,21 рубля,** сумма задатка – **10 597,52 рубля.**

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 4 апреля 2018 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 742095, 720546, 720537.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

УНП 590727594

# СКАНВОРД



Вежа з сігнальнымі агнямі

...- ежа розуму (прык.)

Страта, шкода

Зямельная мера

Адзінка вагі

Палаткі пушны звярок

Тое, што і фільм

Бавоўна ў аптэцы

Пасудзіна для кветак

Дэсерт на юбілеі

Колючая зброя на дрэўку

Сябар чалавека

Сольны нумар оперы

Пакет для малака

Прадукт творчай працы

Расліна сямейства злакаў

Запал, захапленне

Вучнёўскі стол

Абутак на драўлянай падэшве

Тэхнічны малюнак

Паведамленне аб грашовай аперацыі

Вокліч пахвалы, адабрэння

Язык ядавітай змяі

Няшчасце, нядоля, гора

Эпізод у п'есе, рамане

Вада ў стане кіпення

Прыгонны селянін

Насавая частка палубы

Жыхар Егіпта

Завітыя пасмы валасоў

Дзвярная засоўка

Гнойная ранка на скуры

Пліта над калонай

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Акр. Янот. Кіно. Вата. Сабака. Азарт. Твор. Парта. Сцэна. Бяда. Вар. Буклі. Араб. Завала. Язва. Абак.

**Па вертыкалі:** Маяк. Урон. Кніга. Тона. Ваза. Торт. Сівец. Баран. Капʼё. Арыя. Тара. Сабо. Эскіз. Авіза. Брава. Джала. Раб. Бак.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.23 | 19.15 | 11.52 |
| Віцебск — | 7.12 | 19.05 | 11.53 |
| Магілёў — | 7.13 | 19.05 | 11.52 |
| Гомель — | 7.09 | 19.02 | 11.53 |
| Гродна — | 7.38 | 19.31 | 11.53 |
| Брэст — | 7.38 | 19.31 | 11.53 |

## Месяц

*Апошняя квадра 9 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

***Пр.** Васіліска, Зінона.*
***К.** Ізабелы, Гіляра, Рэната.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 16 САКАВІКА

У краіне

**1597** год — горад Віцебск атрымаў самакіраванне паводле магдэбургскага права.

**1598** год — на старабеларускай мове выдадзены «Апакрысіс» — палемічны твор Хрыстафора Філалета, накіраваны супраць Брэсцкай уніі і яе заступнікаў. З'явіўся ў адказ на кнігі яе апалагетаў П. Скаргі і І. Пацея. З гэтага часу на працягу 50 гадоў вялася актыўная палеміка паміж праваслаўнымі і ўніяцкімі тэолагамі.

**1633** год — у Мінску ў раёне былога Верхняга рынку заснаваны касцёл і кляштар бернардынак —- помнік архітэктуры барока (у сярэдзіне XIX стагоддзя касцёл быў пераабсталяваны пад праваслаўную кафедральную царкву).

**1954** год — першыя групы студэнтаў з Беларусі адправіліся ў Казахстан на асваенне цалінных зямель.

У свеце

**1787** год — нарадзіўся Георг Ом, нямецкі фізік. У 1826 годзе эксперыментальна адкрыў закон электрычнага ланцуга (закон Ома), у 1827 годзе вывеў яго тэарэтычна. Аўтар прац па акустыцы, крышталяоптыцы. Устанавіў прынцып успрымання гукаў вухам чалавека (акустычны закон Ома). Памёр у 1854 годзе.

**1859** год — нарадзіўся Аляксандр Папоў, рускі фізік і электратэхнік, адзін з вынаходнікаў радыё. Навуковыя інтарэсы Папова ляжалі ў галіне электрадынамікі. Ён паставіў мэту сканструяваць бесправодную сігналізацыю для выкарыстання на флоце на аснове электрамагнітных хваляў. На прайшоўшым 7 мая 1895 года пасяджэнні фізічнага аддзялення Рускага фізіка-хімічнага таварыства Паповым быў прадстаўлены навуковы даклад аб выкананні бесправаднай сувязі і прадэманстравана яе работа. У памяць аб гэтай падзеі з 1945 года 7 мая ў СССР адзначаўся Дзень радыё. Удасканальваючы апараты, якія перадавалі і прымалі радыёсігналы, Папоў дамогся далёкасці перадачы сігналаў у 150 кіламетраў. Памёр у 1906 годзе.



**1890** год — нарадзіўся Саламон Міхайлавіч Міхоэлс, расійскі акцёр, рэжысёр, педагог, народны артыст СССР. З 1920 года працаваў у Дзяржаўным камерным тэатры ў Маскве, з 1929-га яго мастацкі кіраўнік. З 1941 года — старшыня Антыфашысцкага яўрэйскага камітэта. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946). Памёр у 1948 годзе.

**1918** год — нарадзіўся Фрэдэрык Райнес, амерыканскі вучоны, член НАН ЗША, нобелеўскі лаўрэат (1995). Продкі Райнеса — выхадцы з Беларусі. Удзельнічаў у распрацоўцы і выпрабаваннях атамнай і ядзернай зброі. Аўтар навуковых прац па фізіцы элементарных часціц, фізіцы касмічных прамянёў і нейтрына, радыебіялогіі. Яго працы ляжаць у аснове ўсіх сучасных метадаў выяўлення нейтрыннага выпраменьвання. Памёр у 1998 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Ювелірныя крамы для жанчын — гэта выхад з дэпрэсіі.**
**Для мужчын — увахад.**

З тлумачальнай начальніку аховы гандлёвага комплексу.

«Я, Наталля, не каталася на вазку, проста ўстала на яго, каб дастаць чырвонае вядро з верхняй паліцы, але не ўтрымалася і ўпала на яго. У выніку вядро само надзелася мне на галаву, а швабру я схапіла па дарозе, каб тармазіць.

«Эге-ге-гей!» крычала, каб папярэдзіць сустрэчных пакупнікоў аб небяспецы. А пустыя бутэлькі з-пад каньяку валяліся там яшчэ да мяне».




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1072.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 сакавіка 2018 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

16 сакавіка 2018 г. № 10 (443)




стар. 3

**Ці паспяваюць законы за жыццём?**



стар. 14

**Чаму нас цягне на Радзіму**



стар. 15

**Хто ў пад'ездзе жыве?**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ТРАМПЛІН ДЛЯ РАШУЧЫХ



**З СОТНІ БЕСПРАЦОЎНЫХ АБАВЯЗКОВА ЗНОЙДЗЕЦЦА НЕКАЛЬКІ ЧАЛАВЕК, ШТО РЫЗЫКНУЦЬ АДКРЫЦЬ УЛАСНУЮ СПРАВУ**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ХТО сыходзіць «у бізнес» і мае права на першапачатковую субсідыю? Якія рызыкі найбольш палохаюць бізнесменаў? Чаму можна навучыць чалавека за тры тыдні? І, нарэшце, у якіх выпадках рамесніцкую дзейнасць афармляюць як прадпрымальніцкую? Пра гэта мы пацікавіліся ў Ірыны ВАРАТЫНСКАЙ, начальніка аддзела садзейнічання занятасці насельніцтва ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Маладзечанскага райвыканкама.**

**На пачатак гэтага года ў Маладзечанскім раёне на ўліку знаходзілася 486 беспрацоўных. У той жа час спецыялісты ўпраўлення дапамаглі знайсці новае месца работы 2360 грамадзянам. З іх 22 сталі індывідуальнымі прадпрымальнікамі і яшчэ двое зарэгістравалі рамесніцкую дзейнасць. Недасведчанаму чалавеку апошнія лічбы статыстыкі могуць падацца кропляй у моры, аднак спецыялісты перакананы ў адваротным.**

— Як мінімум, гэтыя людзі ўжо займаюцца справай, выплачваюць падаткі і, магчыма, стануць пашырацца, а значыць, ствараць вакансіі для іншых зацікаўленых у працаўладкаванні. Пры рэгістрацыі інспектар расказвае беспрацоўнаму, якія існуюць дадатковыя меры садзейнічання занятасці. Хтосьці, напрыклад, задаволіцца сезоннымі, грамадскімі работамі — гэта часовая праца, разлік за яе ідзе як наяўнымі грашыма, так і агароднінай. Для большасці спецыялісты падбіраюць работу ў адпаведнасці з узроўнем адукацыі, папярэднім працоўным вопытам і сумай заробатнай платы. У законе аб занятасці ўсе гэтыя катэгорыі прапісаны. Аднак здараюцца выпадкі, што чалавек з уважлівай прычыны не можа заступіць на работу. Калі цягам месяца не ўдалося знайсці прыдатную пасаду, такому саіскальніку прапануем субсідыю на адкрыццё ўласнай справы.

стар. 4

ЗНОЎ І ЗНОЎ

# ВУЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ ПІЛЬНАСЦІ

## ГЭТА АДЗІНЫ СПОСАБ АБАРАНІЦЬ АД МАХЛЯРОЎ НАШЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ

**Махляры жывуць на гэтым свеце ледзь не прыпяваючы. Ім нічога не страшна. Яны ідуць у нагу з часам, некаторыя ўжо ўзброіліся інфармацыйнымі тэхналогіямі, інтэрнэт паставілі сабе на службу. А што не мяняецца са зменай эпох, дык гэта спрыяльная глеба, на якой прарастае махлярства — людская даверлівасць і неабачлівасць. Махляры — добрыя псіхолагі. Яны ўмеюць увайсці ў давер, прытупіць пільнасць, загаварыць аб надвор'і і здароўі, расказаць навіны. А потым паступова перайсці да справы.**

### Новыя тэхналогіі

На маладзейшае пакаленне разлічаны перш за ўсё інтэрнэт-пасткі. Ужо амаль класічны выпадак: махляр, знаходзячыся ў Партугаліі, прадаваў кватэру ў Брэсце па вуліцы Горкага. Так танна прадаваў, што даверлівая брастаўчанка пераявіла невядома каму 10 тысяч долараў... Гады два таму наша газета расказвала, як «нявеста» са Столінскага раёна знаходзіла жаніхоў у сацсетках, вяла любоўную перапіску, а тыя, нібы здурнеўшы, пераводзілі ёй грошы на будучую кватэру, на вясельныя строі, на афармленне дакументаў. Потым высветлілася, што «нявеста» замужам, яна шматдзетная маці, але сяброў па перапісцы мае багата. Проста не ўсе адважыліся напісаць заявы ў міліцыю, прыйсці ў суд. Такія ахвяры махлярства, несумненна, выклікаюць спачуванне, але з папраўкай: маглі б усё ж раскінуць мазгамі, перш чым перадаваць грошы невядома каму. А вось старых людзей вельмі шкада. А іх па-ранейшаму крыўдзяць. Махляры не саромеюцца зайсці ў дом, проста ўкрасці пенсію альбо ўсе зберажэнні, прытупіўшы пільнасць, прымусіць купіць за вялікія грошы сапраўдную драбязу, зусім непатрэбную.

стар. 16



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ЗАКОНЫ — АД ЖЫЦЦЯ

*Спікер верхняй палаты — пра беспамылковыя заканадаўчыя рашэнні*

**Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Інструменты павышэння эфектыўнасці нарматворчай дзейнасці» адбылася ў Савеце Рэспублікі.**

Адкрываючы яе, **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** адзначыў, што Беларусі ёсць чым ганарыцца ў фарміраванні сучаснага і досыць поўнага заканадаўства, але жыццё не стаіць на месцы. І калі ў першыя гады дзяржаўнага будаўніцтва нароўні з сістэмнымі, кадыфікаванымі заканадаўчымі актамі прымалася значная колькасць нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць асобныя пытанні, а таксама канцэптуальныя напрамкі развіцця, то цяпер праца ідзе над комплекснымі і сістэмнымі заканадаўчымі рашэннямі.

Паводле яго слоў, даводзіцца ў практычнай дзейнасці сутыкацца з фактамі месніцтва, ведамаснасці, якія наносяць шкоду рэальнай справе. «Калі гаворка ідзе пра важныя дзяржаўныя задачы, не павінна быць пазіцыі «мая хата з краю!». Намаганні ўсіх дзяржаўных і камерцыйных структур варта падпарадкаваць дасягненню пастаўленых мэт», — падкрэсліў спікер верхняй палаты.

«Наша агульная задача — выпрацаваць беспамылковыя заканадаўчыя рашэнні, якія забяспечваюць фарміраванне спрыяльных умоў для развіцця эканомікі, а ў канчатковым выніку — дабрабыт кожнага грамадзяніна», — дадаў Міхаіл Мясніковіч. У гэтым пытанні на парламент ускладаецца асаблівая адказнасць: ён прымае законы — нарматыўныя прававыя акты, якія замацоўваюць прынцыпы і нормы рэгулявання найбольш важных грамадскіх адносін.

Удзельнікамі канферэнцыі сталі члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, прадстаўнікі Канстытуцыйнага Суда, Вярхоўнага Суда, шэрагу міністэрстваў, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, навукоўцы і замежныя эксперты.

# СА СВЯТАМ, ЖАНЧЫНЫ!

*У Савеце Рэспублікі павіншавалі прадстаўніц прыгожай паловы*

**Колькасць жанчын — а іх нямала — гэта тое, чым можа пахваліцца беларускі парламент. Ёсць каго віншаваць! Святочнае мерапрыемства, прысвечанае Міжнароднаму жаночаму дню, прайшло ў Савеце Рэспублікі напярэдадні Свята.**



Членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і работнікаў Сакратарыята Савета Рэспублікі павіншавалі народны артыст Беларусі Васіль Раінчык і ансамбль «Верасы».

Нагадаем, што з 23 лютага сенатараў і работнікаў Сакратарыята Савета Рэспублікі павіншавалі артысты беларускай эстрады — Алена Ланская і Настасся Масквіна.

# ЧАКАЕМ ІНДЫЙСКІЯ ІНВЕСТЫЦЫІ

*Гатовы абмяркоўваць магчымыя варыянты*

**У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАХМАНАВА з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Панкаджам Саксена. Бакі абмеркавалі пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.**

Асаблівая ўвага аддадзена магчымасцям удзелу індыйскіх кампаній у будаўніцтве мультымадальнага прамыслова-лагістычнага комплексу ў пасёлку Балбасава Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Беларусь зацікаўлена ў стварэнні на яго базе буйнога індыйскага інвестыцыйнага кластара для прыцягнення прамых замежных інвестыцый для рэалізацыі праектаў у галіне фармацэўтыкі, машынабудавання, тэкстыльнай прамысловасці, сельскай гаспадаркі. «На дадзеным этапе нам важна знайсці канкрэтных партнёраў з індыйскага боку для рэалізацыі праектаў у Балбасаве і мы гатовыя абмяркоўваць магчымыя варыянты кааперацыі», — падкрэсліў Сяргей Рахманаў.

У найбліжэйшы час у Савеце Рэспублікі адбудзецца нарада пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча, упаўнаважанага па супрацоўніцтве з Індыяй, дзе разгледзяць канкрэтныя ўмовы рэалізацыі запланаваных у Аршанскім раёне праектаў. «Мы зацікаўлены ў прыцягненні да іх абмеркавання прадстаўнікоў навуковай і дзелавой супольнасці — для таго каб не толькі дэталёва расплanaваць намечаныя дзеянні, але і эфектыўна выбудаваць агульную стратэгію развіцця супрацоўніцтва з Індыяй па прыярытэтных напрамках», — дадаў Сяргей Рахманаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

СЕСІЯ

# КАРЫСНАЯ ПЕРАЕМНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЙ

## Адбылася першая сесія Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў новага склікання

**СТАРШЫНЁЙ Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў абрана Кацярына ЗЕНКЕВІЧ. Дэпутаты 28-га склікання аднагалосна аддалі перавагу прадстаўніцы ад Бярэзінскай выбарчай акругі № 55, якая да гэтага ўзначальвала Гомельскі абласны тэрытарыяльны фонд дзяржаўнай маёмасці.**



**Старшыня абласнога выканкама Аляксей НЯВЕРАЎ** адзначыў, што падчас выбарчай кампаніі было зарэгістравана 147 прэтэндэнтаў у абласавет. Конкурс склаў 2,5 кандыдата на месца. На выбарах, якія адбыліся 18 лютага, пры высокай актыўнасці абраны 60 дэпутатаў абласавета.

— Па ўзросце склад дэпутатаў размяркоўваецца наступным чынам: да 41 года — 2 чалавекі, ад 41 да 50 гадоў — 32 чалавекі, ад 51 да 60 гадоў — 24 чалавекі, больш за 60 — 2 чалавекі. Найбольш у абласным Савеце прадстаўнікоў прамысловасці, транспарту і будаўнічых арганізацый. Ёсць адзін прадпрымальнік. У ліку дэпутатаў тры члены Камуністычнай партыі Беларусі. Па два прадстаўнікі — ад Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці і Сацыял-дэмакратычнай партыі народнай згоды, 53 беспартыйныя.

На сесіі прызнаны паўнамоцтвы Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання. Аляксей Няверaў павіншаваў новы склад і пажадаў поспеху ў рабоце на карысць жыхароў Гомельшчыны. Алег Барысенка, старшыня абласнога Савета дэпутатаў мінулага склікання, прадстаўляючы на гэтую пасаду кандыдатуру Кацярыны Зенкевіч, падкрэсліў, што структура, якую яна ўзначальвала апошнія 10 гадоў, займала лідзіруючыя пазіцыі ў краіне:

— У якасці дырэктара Гомельскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці ёю многа было зроблена для ўцягвання ў гаспадарчы абарот маёмасці. Таму абавязкова будзе эфектыўнасць работы і ў новым кірунку.

Усе, хто рэкамендаваў Кацярыну Зенкевіч, казалі пра яе як пра чалавека, якому ўласцівыя справядлівасць, настойлівасць, сістэмны падыход да справы, адказнасць, самакрытычнасць, патрабавальнасць да сябе і падначаленых.

У рабоце першай сесіі абласнога Савета дэпутатаў прыняў удзел **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК**. Губернатар падзякаваў за працу старшыні абласавета дэпутатаў мінулага склікання Алегу Барысенку, а таксама павіншаваў яго пераемніка — Кацярыну Зенкевіч з абраннем на важную пасаду. Кіраўнік вобласці падкрэсліў прадукцыйнасць працы дэпутацкага корпуса, адзначыўшы, што ў новым скліканні асноўны вектар узаемадзеяння органаў выканаўчай улады і дэпутацкага корпуса будзе скіраваны на далейшае развіццё рэгіёна і павышэнне дабрабыту людзей.

— У сённяшнім складзе абласавета 40 % людзі, якія раней удзельнічалі ў дэпутацкай дзейнасці. Тым, хто толькі прыйшоў у орган прадстаўнічай улады, трэба вучыцца і пераймаць вопыт у іх. На Гомельшчыне заўсёды ёсць пераемнасць традыцый ва ўсіх кірунках. Трэба і надалей развіваць усё самае лепшае і працаваць разам.

На першай сесіі быў абраны і намеснік старшыні Гомельскага абласавета. Ім зноў стаў дэпутат па Крысталаўскай выбарчай акрузе № 10 Алег Іванцоў, які працуе галоўным урачом Гомельскага абласнога клінічнага шпіталя інвалідаў Айчыннай вайны.

На сесіі створана пяць пастаянных камісій абласнога Савета дэпутатаў: па мандатах, законнасці, мясцовым кіраванні і самакіраванні; па эканоміцы, бюджэце, фінансах і камунальнай уласнасці; па прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, сувязі і жыллёва-камунальнай гаспадарцы; па аграрных пытаннях, экалогіі і праблемах пераадолення наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС; па развіцці сацыяльнай сферы. (Дарэчы, камісій стала на дзве менш.)

Новы старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч падзякавала дэпутатам за аказаны давер і падкрэсліла, што асноўная работа народных выбраннікаў будзе накіравана на развіццё і росквіт Гомельскай вобласці:

— Мы працягнем найлепшыя традыцыі, закладзеныя раней. Таксама будзем імкнуцца прынесці новыя перспектыўныя ідэі і ініцыятывы ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. 2018 год абвешчаны Годам малой радзімы, таму самая пільная ўвага будзе ўдзелена навядзенню парадку як у населеных пунктах, сельскіх і гарадскіх, так і на прадпрыемствах. Акрамя таго, нязменнай застаецца задача рашэння надзённых пытанняў, якія хвалююць жыхароў Гомельскай вобласці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ВЯСНОВАЯ РАБОТА

# Працоўны марафон

**У Брэсце аб'яўлены месячнік па навядзенні парадку. І не проста аб'яўлены, а некаторыя службы, установы і арганізацыі прыступілі да прыборкі тэрыторыі. Снег сышоў, падсохла, значыць, самы час вымесці леташняе смецце і сустрэць вясну чыстымі вуліцамі і дварамі.**

Першымі на вясновую работу выйшлі работнікі гарадской камунальнай гаспадаркі. Яны прыбіралі тэрыторыю гарадскога пляжа ўздоўж набярэжнай Францыска Скарыны. Гэта адно з любімых месцаў адпачынку брастаўчан у цэнтры горада.

Далей будзе арганізаваны працоўны марафон па прывядзенні ў парадак вуліц, двароў, сквераў і паркаў, санітарная ўборка зон гарадскіх лесапаркаў і месцаў масавага адпачынку. Летась у гэтай рабоце прынялі ўдзел многія працоўныя калектывы, прадстаўнікі маладзёжных арганізацый, студэнты і школьнікі, прайшлі арганізаваныя гарвыканкамам суботнікі. На іх добраахвотнікі з ліку гараджан зрабілі вялікую работу па ўпрыгажэнні і паляпшэнні горада. Сёлета работа прадоўжыцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Прыборка на набярэжнай Францыска Скарыны.

# І глыбінка папрыгажэе

**У Віцебскай вобласці ў Год малой радзімы плануецца шмат зрабіць для навядзення парадку ў сельскіх населеных пунктах і вакол іх.**

Улічваючы, што сёлета абласныя «Дажынкі» пройдуць у Верхнядзвінску, на тэрыторыі аднайменнага раёна многае зробяць для навядзення прыгажосці. На леташніх — у Дуброўне — **старшыня аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ**, віншуючы сельскіх працаўнікоў, паведаміў, што кожны год будуць атрымліваць новы імпульс для развіцця па два пасёлкі. Сёлета асаблівая ўвага — Езярышчу Гарадоцкага раёна і «спадарожніку» Оршы — Балбасаву. Райвыканкамамі зацверджаны планы па добраўпарадкаванні. Імі прадугледжаны работы па рамонце і ўтрыманні дарог, прыпынкаў і г. д. Запланавана стварэнне і абнаўленне дзіцячых гульнявых пляцовак, рамонт фасадаў будынкаў, добраўпарадкаванне прылеглых тэрыторый і іншае.

Многае будзе зроблена і ва ўсёй вобласці. Як паведамілі ў Віцебскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у прыватнасці, неабходна знесці больш за 430 нежылых і старых дамоў. Падлягаюць вываду з эксплуатацыі і рэкультывацыі 46 міні-палігонаў цвёрдых камунальных адходаў. Плануецца пачаць выкарыстоўваць каля 52 гектараў свабодных зямель, высадзіць 4,7 тысячы дрэў і 4,6 тысячы кустоў.

У першым паўгоддзі запланавана знішчэнне небяспечнай расліны — баршчэўніку Сасноўскага на 2125,3 гектара. З бюджэту вобласці запланавана выдзеліць 310 тысяч рублёў для адпаведнай работы ў 12 раёнах і ў Віцебску. Фінансаванне будзе ажыццяўляцца таксама з бюджэтаў раёнаў, сельвыканкамаў і ўласных сродкаў землекарыстальнікаў...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# ЗАКОНЫ ПАВІННЫ ПАСПЯВАЦЬ ЗА ЭКАНОМІКАЙ

**Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, ужо не першае скліканне сярод іншага займаецца аналізам заканадаўства ў гэтай галіне. На яго думку, эканамічны поспех краіны шмат у чым залежыць не толькі ад дзелавой ініцыятывы ўнутранага ці знешняга інвестара, але і ад таго, з якімі дакументамі і ўмовамі вядзення бізнесу яму давядзецца сутыкнуцца.**

***— Аснова работы сенатараў — паляпшэнне законаў. Як у гэтым кірунку складваецца работа камісіі, якую вы ўзначальваеце?***

— Перакананы, што заканатворчая праца не церпіць мітусні, а патрабуе сур'ёзнай удумлівай работы, вывучэння велізарнай колькасці матэрыялаў. Хачу падкрэсліць, што асноўная работа камісіі сканцэнтравана на заканадаўчым забеспячэнні прыярытэтаў, якія былі ўхвалены на V Усебеларускім народным сходзе. Яны, мяркую, ва ўсіх на слыху — інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя і моладзь.

Перш за ўсё, наступіў час працаваць, працаваць па-сапраўднаму, а не толькі шукаць і знаходзіць інвестыцыі. Інвестыцыі — гэта аснова для эканамічнага росту. Гэта відавочна. Будуць інвестыцыі, значыць, зможам забяспечыць эфектыўную занятасць, правесці глыбокую мадэрнізацыю. Гэта рост канкурэнтаздольнасці, а значыць, экспарту і валютнай выручкі ў краіну.

Разам з тым сітуацыя ў інвестыцыйнай сферы выклікае вялікую занепакоенасць. Агульнавядома, што зніжэнне працягваецца ўжо чатыры гады. Можа, гэта ўжо і нагнала аскому, але я паўтару — адным з дзейсных механізмаў павышэння прывабнасці краіны для інвестара з'яўляецца далейшае ўдасканаленне інвестыцыйнага заканадаўства. Такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы.

***— Якія хібы ў заканадаўстве бачыць камісія?***

— Прымаючы ўдзел у распрацоўцы плана мерапрыемстваў па ўдасканаленні інвестыцыйнага клімату, мы зразумелі, што інвестыцыйная прывабнасць



краіны не вычэрпваецца сістэмай ільгот для інвестараў і субсідый для вытворцаў інавацыйнай прадукцыі. Яна ўключае ў сябе і палітычную стабільнасць, празрыстасць, наяўнасць антыкарупцыйных механізмаў. Найбольш значныя прапановы — гэта забеспячэнне гарантыі для інвестараў пры змене заканадаўства, укараненне механізма страхавання інвестыцыйных рызык, перагляд падыходаў да субсідыярнай адказнасці ў выпадку банкруцтва.

Але, нягледзячы на шэраг няўзгодненых пазіцый з эканамічным блокам урада і профільнымі міністэрствамі па падыходах да ўдасканалення інвестыцыйнага заканадаўства, мы ўсё ж такі канструктыўна працуем з усімі зацікаўленымі ўдзельнікамі гэтага складанага працэсу.

Забягаючы крыху наперад, скажу, што восенню 2018 года плануюцца парламенцкія слуханні па тэме паляпшэння інвестыцыйнага клімату. Мяркую, што ў рамках гэтага мерапрыемства ў нас будзе яшчэ адна магчымасць «зверыць гадзіннікі» па грунтоўных пытаннях у гэтай складанай сферы. Але толькі праца, яе вынік могуць даказаць, што інвестыцыйны клімат у нас рэальна не горшы, чым сітуацыя ў эканоміцы.

***— Інвестыцыі прыносяць і шэраг новых працоўных месцаў...***

— Сапраўды, ні час, ні працу спыніць нельга. Пры тым штогод колькасць насельніцтва, занятага ў эканоміцы Беларусі, скарачаецца. У членаў нашай камісіі сфарміравалася ўстойлівае меркаванне, што гэты негатыўны трэнд абумоўлены не толькі дэмаграфічным фактарам. Міграцыя, нізкі ўзровень аплаты працы, ценявы сектар уносяць свой «уклад» у зніжэнне паказчыка занятага насельніцтва. Упэўнены, што ў сярэднетэрміновым перыядзе забеспячэнне эфектыўнай занятасці стане адным з галоўных выклікаў для ўсёй вертыкалі ўлады.

У краіне створаны беспрэцэдэнтныя прававыя ўмовы для развіцця прадпрымальніцтва, самазанятасці. Прыняты пакет нарматыўных прававых актаў па лібералізацыі бізнесу і разняволенні дзелавой ініцыятывы. Шкада, што не ўсе прапановы нашай і іншых камісій Савета Рэспублікі былі ўлічаны. Асноўная ідэя, якая належыць Савету Рэспублікі, — прыняцце актаў «пакетным прынцыпам», на жаль, не прайшла.

***— А што вы скажаце пра сітуацыю з экспартам?***

— Асноўную долю выпрабленай прадукцыі — дзве трэція — трэба экспартаваць (каб не павялічваць складскія запасы). Не сакрэт, што гэта складаная справа. Сёння ўсе дзяржавы імкнуцца абараніць унутраны рынак і падтрымаць нацыянальных вытворцаў. Гэта жорсткі рэалізм. Перамога толькі ўпартых. І мы павінны быць такімі.

На нашу думку, варта неадкладна стымуляваць бюджэтныя механізмы падтрымкі экспарту. У той жа час яе аб'ём павінен быць абгрунтаваным. На гэта мы звярталі ўвагу распрацоўшчыкаў праекта бюджэту на гэты год.

Найважнейшае пытанне экспартнай стратэгіі — дыверсіфікацыя паставак. У межах міжнароднай дзейнасці мы імкнёмся, на мой погляд, спрыяць фарміраванню станоўчага іміджу беларускай прадукцыі. Зручнай пляцоўкай у пашырэнні развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і, у прыватнасці, экспарту павінен стаць V Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбудзецца сёлета.

***— Нядаўна прыняты так званы дэкрэт «ПВТ 2.0» мусіць спрыяць развіццю эканомікі і, галоўнае, — IT-сектара.***

— Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі» стане «дарожнай картай» для дзяржаўных органаў па нарошчванні долі інфармацыйных паслуг у ВУП краіны і выкананні задачы кіраўніка дзяржавы аб фарміраванні IT-краіны.

Лічым, што найважнейшай мэтай лічбавізацыі эканомікі з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці бізнесу. Пацвярджаецца гэта і тым фактам, што Дэкрэт № 8 увайшоў у пакет нарматыўных прававых актаў па лібералізацыі бізнесу і разняволенні дзелавой ініцыятывы.

Мы сваю работу накіруем на заканадаўчае забеспячэнне лічбавізацыі галін эканомікі. Для гэтага плануецца прапрацаваць з зацікаўленымі пытанне аб фарміраванні асобнай дзяржаўнай праграмы па развіцці лічбавай эканомікі, арганізаваць абмен вопытам з замежнымі калегамі, правесці адпаведную секцыю на V Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, папулярызаваць сярод насельніцтва канцэпцыю лічбавых тэхналогій і яе ўкараненне ў вытворчыя працэсы.

> У сярэднетэрміновым перыядзе забеспячэнне эфектыўнай занятасці стане адным з галоўных выклікаў для ўсёй вертыкалі ўлады.

Каб якасна ўплываць на ўсе сферы грамадскага жыцця, лічбавая эканоміка не павінна быць эканомікай для абраных.

***— Асобнае пытанне для вашай камісіі — бюджэт.***

— Гэта асобны блок нашай работы. Сфарміраваць бюджэт у жорсткіх умовах было няпроста. І ўсё ж гэта лягчэй, чым яго выконваць. Нам спатрэбіцца напружаная праца ўсяго насельніцтва краіны, працоўных калектываў, улада ўсіх узроўняў. Многае, што робіцца ў краіне сур'ёзна, грунтоўна, робіцца за кошт бюджэту.

Сёлета плануецца распрацоўка законапраекта, які прадугледжвае комплексную карэкціроўку Падатковага кодэкса на прынцыпах стабільнасці, зразумеласці прававых нормаў і лёгкасці іх усплымання. Пастаянная камісія і профільнае ўпраўленне Сакратарыята прымуць непасрэдны і ініцыятыўны ўдзел у гэтай рабоце. Дакладней, мы ўжо яе пачалі ў складзе рабочай групы, створанай у мэтах комплекснай карэкціроўкі Падатковага кодэкса.

У адпаведнасці з патрабаваннямі старшыні Савета Рэспублікі асаблівую ўвагу мы ўдзяляем аналізу праваправымяняльнай практыкі, маніторынгу заканадаўства. У 2017 годзе праводзіўся маніторынг Закона «Аб гаспадарчых таварыствах». Важнасць гэтага закона пацвярджаецца адной лічбай. У нашай краіне каля 140 тысяч юрыдычных асоб, з якіх каля 65 тысяч з'яўляюцца гаспадарчымі таварыствамі.

> Будуць інвестыцыі, значыць, зможам забяспечыць эфектыўную занятасць, правесці глыбокую мадэрнізацыю.

У межах маніторынгу мы звярнулі ўвагу на аналагічныя законы нашых сяброў па Еўразійскім эканамічным саюзе і Еўрасаюзе. На жаль, пры канцэптуальным падабенстве маюцца прынцыповыя адрозненні, якія, на думку камісіі, не на нашу карысць. Заканадаўствы Расіі і Казахстана прадугледжваюць дзяленне акцыянерных таварыстваў на публічныя і непублічныя (а гэта перавага для інвестара), замацаваны механізм сек'юрытызацыі (магчымасць рэструктурызацыі даўгоў гаспадарчых таварыстваў шляхам канвертавання даўгавых абавязацельстваў у акцыі (долі).

Наш Закон мае шэраг прабелаў, якія павінны быць ліквідаваны. Толькі адзін прыклад — неабходна адмяніць забарону на ўдзел гаспадарчага таварыства ў якасці адзінага ўдзельніка ў іншым таварыстве. Гэта абмежаванне негатыўна адбіваецца ў адносінах да замежных юрыдычных асоб з адным удзельнікам. Выпрацаваныя падчас маніторынгу рэкамендацыі накіраваны ў Савет Міністраў. Работа па карэкціроўцы Закона аб гаспадарчых таварыствах працягнецца ў бягучым годзе.

Хачу нагадаць выказваннепатрабаванне кіраўніка дзяржавы: «Сенатары павінны, ідучы ад жыцця, ад практыкі, адказаць на пытанне: ці прынясе той ці іншы закон рэальную карысць людзям і краіне?» Вось мы і працуем у гэтым кірунку.

Хачу з упэўненасцю заявіць: змены прававога ландшафту ў эканоміцы, якія адбываюцца сёння пры ўдзеле нашай Пастаяннай камісіі, ужо ў гэтай пяцігодцы акажуць пазітыўны ўплыў на эканамічнае развіццё дзяржавы.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ДАПАМАГЛІ ЗВЕСЦІ ДЭБЕТ З КРЭДЫТАМ

**Адна з праблем сённяшніх прадпрыемстваў — дэбіторская запазычанасць, калі спажыўцы іх тавараў, паслуг, работ своечасова не вяртаюць грошы. Гэта прыводзіць да зніжэння абаротных сродкаў, праблем з выплатай заработнай платы і, як вынік, пагаршэння фінансавага становішча самога прадпрыемства. Летась органамі пракуратуры Магілёўскай вобласці было праверана 30 арганізацый дзяржаўнай уласнасці і выяўлены шэраг парушэнняў.**

— Росту знешняй пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці шмат у чым спрыялі дрэннае вывучэнне фінансавай стабільнасці і платежаздольнасці контрагентаў, парушэнні парадку заключэння і выканання дагавораў, неналежная якасць правядзення прэтэнзійна-іскавай дзейнасці па спагнанні пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці, недастатковы ўзровень кантролю за дзейнасцю ўласнай тавараправоднай сеткі, — адзначыў намеснік начальніка аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Аляксандр Катляр.

Па выніках праверак органамі пракуратуры для ліквідацыі парушэнняў суб'ектам гаспадарання накіравана 18 актаў нагляду, прыцягнута да дысцыплінарнай адказнасці 12 асоб. У мэтах абароны эканамічных інтарэсаў прадпрыемстваў падрыхтавана і накіравана ў эканамічныя суды 4 іскавыя заявы аб спагнанні знешняй пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці на агульную суму 10,3 мільёна расійскіх рублёў і 467 тысяч еўра. Пры садзейнічанні органаў пракуратуры арганізацыям вобласці вернута 18,7 мільёна расійскіх рублёў і 13 тысяч еўра. Па фактах несвоечасовых разлікаў за пастаўленую прадукцыю нерэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь распачатыя крымінальныя справы ў дачыненні да службовых асоб адкрытых акцыянерных таварыстваў «Папяровая фабрыка «Спартак» і «Малочныя горкі», а таксама суб'екта гаспадарання з Санкт-Пецярбурга — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Еўрапалімер».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЕРКАВАННІ

## БІЗНЕС ПА-БЕЛАРУСКУ

**Якія сферы сёння найбольш перспектыўныя для бізнесу? Як зарабляць грошы, пачынаючы з дзіцячага садка? І чаму бізнес — гэта вечная барацьба? Мы запыталі ў спецыялістаў, ці ўласцівая беларусам прадпрымальніцкая ініцыятыва?**

**Сяргей СТРЭЛЬЧЫК, віцэ-старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў:**

— Беларусам уласцівае імкненне да добрага, матэрыяльна забяспечанага жыцця, і таму яны жадаюць займацца прадпрымальніцтвам. У рамках магчымасцяў нашага грамадскага аб'яднання мы дапамагаем ім у гэтым. Саюз звяртае ўвагу ўлады на праблемы бізнесу, адзначаючы пэўныя недапрацоўкі ў заканадаўстве. Дапамагаем на больш высокім узроўні вырашаць уласныя праблемы нашых сяброў. Якая матывацыя займацца прадпрымальніцтвам — атрымаць прыбытак ці рэалізавацца? Я не магу адназначна сказаць, што на першым месцы. Зарабляць грошы — гэта адна з магчымасцяў самарэалізацыі. Але матэрыяльны складнік таксама вельмі важны.

Як і ўсім дзелавым людзям у свеце, беларусам цікавы тыя сферы бізнесу, якія дазваляюць зарабляць грошы з меншай рызыкай. Сёння можна заўважыць, што перспектыўнымі з'яўляюцца розничны і аптовы гандаль, перавозкі, будаўніцтва. Гэтыя сферы больш эфектыўныя з боку ўкладання капіталу і аддачы грошай.

**Валерый БАРАДЗЕНЯ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах:**

— У савецкія часы прадпрымальніцтва нават праследавалася законам. (Напрыклад, спекулянты маглі атрымаць 25 гадоў турмы ці нават вышэйшую меру пакарання.) Але гэта і было праяўленнем прадпрымальніцкай ініцыятывы. Гісторыя ўскладніла канкурэнтаздольнасць нашага бізнесу на сусветнай арэне...

На мой погляд, прадпрымальніцкая ініцыятыва выхоўваецца. Калі, дзякуючы атмасферы, чалавек не будзе баяцца зрабіць памылку, думаю, рэалізацыя магчымасцяў хутка набярэ моц. Прадпрымальніцкая ініцыятыва — гэта мастацтва аб'ядналь любыя эканамічныя рэсурсы для атрымання максімальнага эфекту. Я ўпэўнены, што ў нас гэта ёсць. Зазірнуўшы ў гісторыю, убачым, колькі беларусаў сталі вядомыя ў свеце дзякуючы сваім бізнес-праектам! Сёння наша задача — стварыць атмасферу падтрымкі прадпрымальніцтва ў краіне, каб рэалізоўваліся любыя ідэі і пачынанні. Яны дадуць сур'ёзны імпульс для росту эканомікі.

**Лілія КОВАЛЬ, віцэ-старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў:**

— Паводле статыстычных даных, паспяхова займацца прадпрымальніцтвам могуць толькі 4—6 % людзей. Такія ж паказчыкі дзелавой актыўнасці ўласцівы і для насельніцтва Беларусі. На мой погляд, для выхавання бізнес-ініцыятывы трэба змяніць праграмы адукацыі. З дзяцінства неабходна выпрацоўваць прадпрымальніцкія якасці, мысленне, здольнасць не баяцца рызыкаваць, лагічна пралічваць свае крокі. У нашых адукацыйных праграмах гэта адсутнічае, таму не вельмі актыўныя і бізнес-ініцыятывы. Я вывучала амерыканскія праекты развіцця прадпрымальніцтва. Там з ясляў выпрацоўваюцца здольнасці да гэтай дзейнасці.

Напрыклад, да свята ў нас дзеці рыхтуюць сваімі рукамі сувеніры для бацькоў, потым іх дораць. А за мяжой ім у галовы ўкладаюць, што нават гэты малюнак — праца, якая мае свой кошт! Вырабы выстаўляюцца на аўкцыён. Каб падтрымаць кошт створанай прадукцыі, бацькі купляюць сувенір не свайго дзіцяці, а сына ці дачкі суседзяў. Няхай цана вырабу нават адна капейка, але важна, каб дзіця адчула значнасць сваёй працы. Асновы ацэнкі кожнага прадукту і ўсведамленне яго кошту закладваюць асновы прадпрымальніцкага мыслення.

**Мікіта ВЯЛЬМАСКІН, прадпрымальнік у сферы IT, г. Мінск:**

— Гістарычна прадпрымальніцтва на тэрыторыі Беларусі было ў росквіце. На фатаграфіях дарэвалюцыйнай Міншчыны і Гомельшчыны можна заўважыць шмат уласных прадпрыемстваў. У савецкія часы прадпрымальніцтва спынілася. Мы прайшлі пераломныя 90-я гады, калі ўсталёўвалася наша маладая дзяржава. Пасля 2000-х пачало аднаўляцца прадпрымальніцтва. Прайшло ўсяго 18 гадоў, гэта фактычна падлеткавы ўзрост для бізнесу... Я вельмі рады, што сёння людзі цікавяцца прадпрымальніцтвам. Калі ў эканамічнай сітуацыі адбываюцца нечаканыя змены, некаторыя адразу апускаюць рукі. Гэта паказвае, што чалавек не зразумеў: бізнес — вечная барацьба. Мільёны долараў не з'яўляюцца адразу. Прадпрымальніцтва — гэта самадысцыпліна. Прадстаўнікі бізнес-колаў сцвярджаюць, што прадпрымальнікі — эліта грамадства. Я з гэтым згодны, таму што яны рызыкуюць, ствараюць, і эканоміка краіны ў значнай ступені залежыць ад развіцця прадпрымальніцтва.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ТРАМПЛІН ДЛЯ РАШУЧЫХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

**— Можаце вылучыць нейкія агульныя рысы будучага прадпрымальніка?**

— Не існуе агульных прыкмет па ўзросце, адукацыі ці якой іншай якасці. У прадпрымальніцтва сыходзяць як моладзь, так і старэйшае пакаленне, мужчыны і жанчыны. З ужо згаданых 22 чалавек 11 жывуць і працуюць у вёсках. Што характэрна, колькасць заргэгістраваных бізнесменаў штогод трымаецца на адным узроўні. Так, у 2016-м было 23 заявы, у 2015-м — 22, за 2014 год сваю справу адкрылі 25 чалавек... Але мала прыйсці і сказаць: «Хачу быць прадпрымальнікам, але не ведаю, чым займуся». Патрэбен так званы «бляск у вачах» — гэта калі чалавек разумее, што з дапамогай субсідыі рэалізуе мару, атрымае жаданы і любімы занятак.

**— Якія дакументы неабходны, каб адкрыць сваю справу?**

— Патрэбны заява і бізнес-план. Яшчэ дзейнасць прадпрымальніка павінна быць сацыяльна значнай для раёна. У 2015 годзе Маладзечанскі выканкам прыняў рашэнне і апублікаваў пералік заняткаў, якія падтрымліваюцца субсідыяй. Аднак хай абмежаванне не палохае, бо ў спіс трапілі практычна ўсе віды дзейнасці: розничны гандаль, швейныя, будаўнічыя, касметычныя, турыстычныя паслугі, сельскагаспадарчая вытворчасць, раслінаводства, рыбаводства...

**— На якую дапамогу можа разлічваць былы беспрацоўны? Ці здольна субсідыя стаць стартавай сумай для адкрыцця справы?**

— Каб весці бізнес, патрэбны спецыяльныя веды, прынамсі, у напісанні дакументацыі. Чалавеку без эканамічнай адукацыі цяжка скласці бізнес-план, таму што мы арганізоўваем курсы для будучых прадпрымальнікаў. У якасці лектараў да нашых «студэнтаў» запрашаем работнікаў падатковай інспекцыі, супрацоўнікаў Фонду сацыяльнай абароны. Вучоба ідзе тры тыдні. Што датычыцца субсідыі, то яе памер фіксаваны. Для гарадскога прадпрымальніка прадугледжана выплата ў 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму. Сельскі жыхар атрымае 15 БПМ. Таксама ўлічваецца напружанасць з працаўладкаваннем у раёне. Напрыклад, у Маладзечне ёсць праблема беспрацоўя, таму субсідыі тут павышаны да 15 БПМ для ўсіх жыхароў незалежна ад месца жыхарства.

> Напрыклад, у Маладзечне ёсць праблема беспрацоўя, таму субсідыі тут павышаны да 15 БПМ для ўсіх жыхароў незалежна ад месца жыхарства.

**— А што, калі чалавек хоча займацца спецыфічнымі паслугамі, якія патрабуюць дадатковых ведаў, напрыклад, адкрыць аптэку?**

— Працэдура афармлення аднолькавая для ўсіх. Аднак у аптэкай патрэбна будзе пацвердзіць медыцынскую адукацыю.



**— У многіх выклікае страх пачатак справы. Ці лёгка ў першыя месяцы знайсці спажыўца для свайго тавару або паслугі?**

— «Прагарыць» справа ці прынясе прыбытак — вырашаюць самі саіскальнікі. Наш абавязак якраз запытацца ў прадпрымальніка, чаму ён упэўнены ў поспеху, і высветліць, наколькі справядліва ён ацэньвае свае магчымасці. Магу сказаць, што адсутнасць кліентаў — не такая вялікая праблема, значна часцей людзей хвалюе рызыка страты працаздольнасці, бо чалавек на час лячэння страчвае заказчыкаў і фактычна страчвае работу. Тут ужо неабходна паклапаціцца пра страхаванне, ахову працы. Наогул, усе магчымыя рызыкі прапісваюцца ў сямі раздзелах першапачатковага бізнес-плана.

> Адсутнасць кліентаў — не такая вялікая праблема, значна часцей людзей хвалюе рызыка страты працаздольнасці.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У першым саіскальнік падае рэзюмэ, расказвае пра сваю адукацыю, сямейнае становішча, месца папярэдняй работы. У другім разглядае юрыдычныя аспекты дзейнасці — нюансы з падаткаабкладаннем, сертыфікацыяй, ліцэнзаваннем (па ўсіх гэтых кірунках можна атрымаць кансультацыю). Вытворчая частка змяшчае апісанне тэхналагічнага працэсу, час работы, колькасць наёмных асоб, памяшканне, транспарт, абсталяванне. Маркетынгавая — пералік канкурэнтаў, недахопы ў іх дзейнасці і свае перавагі. У фінансавым плане ўказваецца мяркуемы кошт і аб'ём паслуг, выдаткі на матэрыялы, выплаты падаткаў у разліку на 12 месяцаў і чаканы прыбытак. Нарэшце, сёмы раздзел патрэбен, каб пралічыць рызыкі і магчымасці страхавання справы. Калі чалавек папрацуе з кожным пунктам, то аўтаматычна праверыць «жыццяздольнасць» свайго праекта.

**— Здаецца, што афармленне рамесніцкай дзейнасці больш выгадна саіскальніку — працэс афармлення вельмі падобны, а выплата падатку меншая і сістэма адказнасці не такая жорсткая. З якіх прычын адны становяцца рамеснікамі, а іншыя выбіраюць прадпрымальніцтва?**

— У прадпрымальніка сапраўды вышэйшая адказнасць і большае падаткаабкладанне. На выбар той ці іншай формы рэгістрацыі ўплывае спосаб рэалізацыі прадукцыі і колькасць задзейнічаных чалавек. Яшчэ ў рамесніка вузкі спектр паслуг. У нашым раёне, напрыклад, распаўсюджаны выраб посуду для кухні і сувенірнай прадукцыі, будоўля альтанак з дрэва. Дарэчы, памятаю выпадак, калі жанчына займалася вырабам сувеніраў і хацела супрацоўнічаць з Мірскім замкам. Ёй давялося афармляць дзейнасць як прадпрымальніцкую, бо гэта было асабістае пажаданне заказчыка прадукцыі. І гэта насамрэч адна з праблем рамесніцтва — у іх няма разліковага рахунку. Для многіх буйных сетак гэта становіцца прычынай адмовы ў супрацоўніцтве. Таксама існуе нюанс з адлічэннямі ў пенсійны фонд. Самазанятыя і рамеснікі не робяць выплаты, значыць у будучыні ў іх могуць узнікнуць праблемы з памерам пенсій.

**— Ірына Чаславаўна, ці кантралюецца работа рамеснікаў і прадпрымальнікаў пасля афармлення рэгістрацыі?**

— Кантроль за дзейнасцю ажыццяўляецца на працягу першага года. Прадпрымальнікі падаюць даведку аб выплаце падатку, дагаворы на аказанне паслугі, справаздачу па выручцы. У рамеснікаў касавай дысцыпліны можа і не быць, таму яны афармляюць дамовы на паслугу і акт выкананых работ, які падпісвае заказчык. Гэта таксама не абавязкова, проста мы папярэджваем, што патрэбна нейкае пацвярджэнне выкананых работ. А вось кантроль якасці тавару або паслугі знаходзіцца па-за нашай кампетэнцыяй.

**— Ці можа прадпрымальнік або рамеснік перапыніць сваю дзейнасць да таго, як скончыцца першы год працы?**

— Калі чалавек атрымаў грашовую дапамогу і не адпрацаваў шэсць месяцаў па заяўленым відзе работ, ён мусіць вярнуць субсідыю дзяржаве.

**— Пасля таго, як дзейнасць ужо аформлена, ці можна атрымаць кансультацыю ад спецыяліста ўпраўлення занятасці?**

— Мы неправамоцныя даваць кансультацыі, калі пытанне датычыцца работы іншай структуры, напрыклад, падатковай службы. Велізарную колькасць інфармацыі саіскальнікі атрымліваюць на курсах. Цяпер усе дзяржаўныя структуры зацікаўлены, каб навучыць чалавека, а не ганяць яго па кабінетах. Нашы супрацоўнікі могуць дапамагчы парадай — падказаць, куды звярнуцца з праблемай.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

Станіслаў ЛІПСКІ:

# «НІ Ў ЧЫМ ТАК ДОБРА НЕ РАЗБІРАЮСЯ, ЯК У СПОРЦЕ»



У алімпійскім Пхёнчхане.

**У спартыўным асяроддзі Белтэлерадыёкампаніі вядучага праграм «Дзень спорту» і «Арэна» Станіслава Ліпскага называюць шчаслівым талісманам беларускай каманды. На Алімпіядах, на якіх пабываў, ён асвятляў спаборніцтвы, дзе беларусы заваёўвалі залатыя медалі. У Рыа-дэ-Жанэйра стаў сведкам нечаканай для многіх перамогі батутыста Уладзіслава Ганчарова, а ў Пхёнчхане — трыумфу фрыстайлісткі Ганны Гуськовай і прыемнага сюрпрызу жаночай біятлоннай эстафеты. Гэтак жа захапляльна, як пра спорт, Стас расказвае... пра суровую мужчынскую прафесію інжынера-металурга. Быў, аказваецца, у яго біяграфіі перыяд, калі давялося працаваць на Жлобінскім металургічным заводзе.**

***— Стас, твая ўсмешка стала пэўнай візітнай карткай навін спорту. У чым сакрэт заўсёды добрага і бадзёрага настрою ў кадры?***

— Мне хутка будзе 29, і я ні ў чым так добра не разбіраюся, як у спорце. І люблю яго больш за ўсё. Расказваць пра спорт, тым больш пра перамогі беларусаў, настолькі лёгка і прыемна, што часам не магу не ўсміхацца. Я не прафесійны спартсмен, але займаўся валейболам, праўда, не дасягнуў вялікіх вышынь, як тыя, пра каго я звычайна кажу. І я разумею, наколькі складаны шлях яны прайшлі. Удвайне прыемна, калі ведаеш спартсмена асабіста, кантактаваў з ім раней як журналіст. Я вельмі люблю сваю справу і лічу, што з гэтым мне ў жыцці пашчасціла.

**«Калі мама даведалася, што я пакідаю завод, яна была вельмі расстроеная. Я ёй сказаў, што, калі не атрымаецца стаць вядучым, уладкуюся слесарам у Белтэлерадыёкампанію».**

***— Ведаю, што на тэлебачанне ты трапіў так: прыйшоў у Агенцтва тэлевізійных навін і сказаў, што хочаш у іх працаваць. І цябе ўзялі...***

— Я тады жыў і працаваў у Жлобіне. У 2012-м па «Беларусь-1» круціўся ролік пра тое, што праходзіць кастынг вядучых. Мяне гэта натхніла: я адправіў сваё рэзюмэ — адзін раз, другі, трэці. Але ніхто не адказаў. Нашмат пазней мяне запрасілі прыехаць. Спробы праходзілі, дарэчы, у студыі, дзе я зараз працую: пасадзілі, я расказаў навіну... і ўсім не спадабалася. Але мне ўдалося паразмаўляць з Кірылам Казаковым, ён у той час быў дырэктарам АТН. Я сказаў, што гатовы шмат вучыцца і працаваць, каб трапіць у спартыўную рэдакцыю. Зразумела, у мяне не было ні адпаведнай адукацыі, ні вопыту. Але мне далі шанц. Спыталі, ці магу размаўляць па-беларуску, а я шмат чытаў беларускай літаратуры. На Жлобінскім металургічным заводзе, дзе я працаваў, даводзілася весці творчыя мерапрыемствы і конкурсы: я крыху танцаваў, крыху спяваў, але фішкай нашага цэха былі вершы на беларускай мове. Мяне накіравалі ў праграму «Навіны рэгіёна». Там пачалі вучыць усяму. Падчас Алімпіяды ў Лондане я дапамагаў у аддзеле спартыўных навін АТН, вучыўся і загартоўваўся. Але вакансій нідзе не было. Праз паўгода, калі ў мяне ўжо скончыліся грошы, якія адкладваў падчас працы на заводзе, і мне давялося падпрацоўваць афіцыянтам, мяне ўзялі ў штат «Навін рэгіёна». Нават выдзелілі рубрыку «Матчбол», каб я неяк задавольваў свае спартыўныя інтарэсы. А яшчэ праз паўгода нарэшце перавялі ў аддзел спартыўных навін АТН вядучым праграмы. Я быў на сёмым небе ад шчасця!

***— У кадр трапіў адразу?***

— Так, амаль адразу. Памятаю свой першы эфір, тады БАТЭ гуляла ў Карагандзе супраць мясцовага «Шахцёра» ў Еўракубку. І наш дыялог з вядучым асноўнай праграмы: «Ну і дзе ж згуляў БАТЭ?» — «У Карагандзе!» Барысаўчане тады, дарэчы, нечакана прайгралі. А адзіны мяч у вароты нашага клуба забіў беларус Ігар Зяньковіч, які выступаў за «Шахцёр». І вось з таго эфіру прайшло ўжо пяць з паловай гадоў — як адно імгненне.

***— Як ты апынуўся на Жлобінскім металургічным заводзе? Працаваў не ў ліцейным цэху, выпадкова?***

— У сумежным, сортапракатным. Там, дзе літую загатоўку квадратнага сячэння ператваралі ў тонкую арматуру. Меркаваў, што атрымаецца падалей ад печы, але не выйшла. Паколькі я быў малады, працаваць паставілі у самым гарачым і брудным месцы цэха. Тэмпература нават зімой — каля 40 градусаў. Я тады жыў удваіх з мамай. Яна зарабляла няшмат, мне хацелася дапамагчы. Так, праца цяжкая, але за гэта добра плацілі. Да таго ж мне было цікава, таму пасля металургічнага тэхнікума я паступіў на завочнае аддзяленне БНТУ на спецыяльнасць «Металургічная вытворчасць і матэрыялаапрацоўка».

***— Дык у цябе былі добрыя перспектывы на заводзе...***

— Я нават выйграў конкурс сярод маладых спецыялістаў, ездзіў на навуковыя канферэнцыі, у прыватнасці на Урал. Наш завод маленькі ў параўнанні з гіганцкімі камбінатамі ў Чалябінску, Магнітагорску. Там выконваецца поўны цыкл: здабыча жалезнай руды, ачыстка і перапрацоўка. Былі нядрэнныя перспектывы, але ў мяне душа ляжала да спорту. У Жлобіне я выступаў за дублюючы склад валейбольнай каманды «Металург». Калі мама даведалася, што я пакідаю завод, яна была вельмі расстроеная. Я ёй сказаў, што, калі не атрымаецца стаць вядучым, уладкуюся слесарам у Белтэлерадыёкампанію.

***— Колькі Алімпіяд удалося наведаць?***

— Пакуль дзве. Рыа-дэ-Жанэйра запомніўся, напэўна, на ўсё жыццё, усё ж такі летняя Алімпіяда больш маштабная. Адны гульнявыя віды спорту чаго вартыя: футбол, баскетбол, валейбол, гандбол, а таксама лёгкая атлетыка. Мне пашчасціла асвятляць спаборніцтвы, дзе Беларусь выйграла адзіны залаты медаль — мужчынскі турнір у скачках на батуце. За тры месяцы да Алімпіяды я ездзіў у Віцебск да Улада Ганчарова і запісваў з ім інтэрв'ю. А ў Рыа ўсё перажыў разам з ім: сачыў за скачкамі, за перамогай, за тым, як наш сцяг падымаўся, спяваў гімн... Да мяне замежныя журналісты, балельшчыкі падыходзілі і віншавалі: было столькі эмоцый і так прыемна!

У Пхёнчхане працаваў на фрыстайле, калі Ганна Гуськова заваявала залаты медаль. Адразу ж у яе ўзяў каментарый. І асвятляў жаночую эстафетную гонку па біятлоне. Тады Ганна Эйсмант пажартавала ў эфіры, што я шчаслівы талісман нашай каманды. Для БАТЭ я, дарэчы, аказаўся нешчаслівым: быў на знакавым матчы, калі барысаўскі клуб на «Камп Ноу» гуляў супраць «Барселоны». І Аляксандр Глеб выйшаў на замену — пад апладысменты амаль ста тысяч балельшчыкаў! Я рос на гульнях Аляксандра Глеба ў «Арсенале», потым памятаю яго пераход у «Барселону», а тут ён у складзе БАТЭ прыехаў гуляць супраць «Барсы»! Барысаўчане тады прайгралі 0:3, але гэта знакавы момант для нашага футбола.



Са стрыечным дзедам, пісьменнікам Уладзімірам ЛІПСКІМ.

***— Пэўным відам спорту аддаеш перавагу?***

— У любым відзе спорту шмат цікавага, і на ўсіх спаборніцтвах я працую з задавальненнем. Асабіста мне падабаюцца ўсе гульнявыя віды, біятлон. Вось зараз у Пхёнчхане быў на спаборніцтвах па лыжных гонках — і адчуў, што гэта вельмі захапляльны для гледачоў від спорту. Хоць і было вельмі холадна.

***— Для тых, хто займаецца асвятленнем спартыўных падзей, гэта, дарэчы, вялікі мінус...***

— У Пхёнчхане было нязвыкла холадна на ўсіх спаборніцтвах на адкрытых пляцоўках. А мне, калі раблю прамыя ўключэнні, больш зручна працаваць без пальчатак. Ёсць і іншыя мінусы. У мяне амаль ніколі субота і нядзеля, святочныя дні не бываюць выхаднымі. Ну і спартсмены, асабліва калі прайгралі, не заўсёды ідуць на кантакт — прыходзіцца хутка прыдумляць нейкія хады, бо не хочацца рабіць пасрэдны сюжэт. Але ў любой рабоце ёсць негатыўныя моманты, і мне грэх скардзіцца.

***— Якія ў цябе захапленні, акрамя любімай працы?***

— У вольны час гуляю ў валейбол на аматарскім узроўні, у нас склалася свая каманда. Удасканальваю англійскую мову, гэта прафесійная патрэба. І вельмі люблю кіно. Асабліва спартыўныя драмы.

***— Цікава, ці спадабаўся расійскі фільм «Рух угору», які знайшоў шмат як прыхільнікаў, так і крытыкаў?***

— Фільм нядрэнны. Але яго ёсць за што пакрытыкаваць. Мне, у прыватнасці, не вельмі спадабалася, як зняты баскетбол — моманты гульні. На мой погляд, ён на самай справе выглядае па-іншаму. Але тут у кожнага сваё асабістае суб'ектыўнае меркаванне.

У нас у Беларусі шмат спартыўных гісторый, можна было б зняць столькі фільмаў! Пра Івана Ціхана, Віталя Шчэрбу, Івана Іванкова... А Кацярына Карстэн увогуле легенда — прайшла шэсць Алімпіяд. Сяргей Далідовіч удзельнічаў у сямі! Дарэчы, у Пхёнчхане журналісты «Голасу Амерыкі» шукалі Сяргея, каб запісаць з ім інтэрв'ю як з рэкардсменам па гэтым паказчыку. Тая ж Віка Азаранка, якая вярнулася ў спорт пасля асабістай няпростай сітуацыі, я ўпэўнены, у 2020 годзе на Алімпіядзе ў Токіа можа пазмагацца за алімпійскі медаль. Ганна Гуськова прайшла да свайго чэмпіёнства вельмі няпросты шлях, прычым з самага пачатку: яна нарадзілася вагой усяго крыху больш за кілаграм, і ў яе спынілася сэрца... У беларускім спорце шмат такіх захапляльных прыкладаў. Хацеў бы выступіць у ролі рэжысёра, прадзюсара, сцэнарыста такога фільма.

***— Ці напісаць кнігу...***

— Стрыечны брат майго дзядулі, беларускі пісьменнік Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі, вельмі добры чалавек, заўсёды, калі сустракаемся, кажа мне: «Ты столькі ўсяго бачыш, кантактуеш з вялікай колькасцю цікавых людзей — занатоўвай, і потым гэта выльецца ў добрую кнігу». Але напісанне кнігі — праца вельмі сур'ёзная, я да яе пакуль не гатовы.

**Алена КРАВЕЦ.**


**«ЗВЯЗДА» — РУПЛІВЫМ ГАСПАДАРАМ!**




Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2018 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2018 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 18.04.2018 г. будуць разыграны 7 набораў садовага інструменту No Brand Тарнада і суперпрыз — мінікультыватар Daewoo Power DAT 1800E. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 28.04.2018 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.06.2018 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2018 г. і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» чытайце ў № 42 газеты «Звязда» ад 01.03.2018 г.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 02.03.2018 г. па 30.06.2018 г.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3211 ад 27.02.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________ на ІІ квартал або І паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ________

______________________________________

______________________________________

Удачы ў розыгрышы!

## Аўторак, 20 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** «Зона Х». (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Усход—Захад» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.25 Серыял «Клан ювеліраў» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**23.45** «Сфера інтарэсаў».
**0.45** «Дзень спорту».
**0.55 Кінаэпапея «Ціхі Дон» (12+).**

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.40** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.45 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10, 17.40 Серыял «Ганнадэтэктыў» (16+).**
**12.15, 22.10** «Арол і рэшка. Юбілейны» (16+).
**13.15** «Паненка-сялянка» (16+).
**14.15** «Бітва салонаў» (16+).
**15.20, 23.10 Серыял «Каварныя пакаёўкі» (16+).**
**16.15, 0.05** «Нічога сабе нюз» (12+).
**16.20, 0.10** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.10** «Багіня шопінгу» (16+).
**20.50** «Абмен жонкамі» (16+).
**22.05** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.20** «Беларуская кухня». Рыбны суп са шчаўем.
**8.05, 12.00, 19.55** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.40 «Пелагія і белы бульдог». Маст. фільм. (12+).**
**9.15, 16.15** «Апошні дзень». Сяргей Эйзенштэйн (12+).
**9.55** «Выйсце ёсць». Павел Харланчук-Южакоў (12+).
**10.20, 17.00** «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу дрэннае надвор'е». Камедыя (12+).
**12.50** «Славянскі базар у Віцебску — 2012». Бенефіс Льва Лешчанкі.
**14.35, 22.25** «Хатынь. Вайна без правіл». Дак. фільм. 1-я серыя (12+).
**15.00, 21.05 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Маст. фільм. (12+).**
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.10** «Беларуская кухня». Бульбяныя дзедкі.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Майстры і куміры». Народная артыстка БССР Вольга Клебановіч.

### Беларусь 5

**7.05** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Другі паўфінал. Трэці матч. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск».
**8.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**9.55** Час футбола.
**10.40** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Трэці матч. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**12.35** Трэніровачны дзень.
**13.05** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**13.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Гонка пераследу. Мужчыны.
**14.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Эстафета. Жанчыны.
**15.55** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/2 фіналу. Трэці матч. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**18.15, 20.55** Спорт-цэнтр.
**18.25** Спорт-кадр.
**18.55** Валейбол. Кубак ЕКВ. Жанчыны. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Мінчанка» (Беларусь) — «Альянс Валей» (Германія).
**21.05** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Другі паўфінал. Чацвёрты матч. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва-Мінск».
**23.05** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Наша жыццё».
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Спартклуб» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Залатая Арда». (16+).**
**23.15 Серыял «А ў нас у двары...» (12+).**
**1.10** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30 «Падкідныя». Серыял (16+).**
**9.20** «Глядзець усім» (16+).
**9.40, 0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Далёкія сваякі» (16+).
**11.50, 17.55 «Энігма». Серыял (16+).**
**13.00** «24 гадзіны».
**13.50 «Джокер. Адплата» Серыял. (16+).**
**15.20** «Дарагая перадача» (16+).
**15.40** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 «Джокер. Аперацыя «Капкан». Серыял (16+).**
**23.50** «Аўтапанарама» (12+).
**0.55 «Пантэра». Серыял (16+).**

### МІР

**6.20, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Чырвоная капэла». (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны.
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 3.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Краіна 03». (16+).**
**22.25, 0.10 Маст. фільм «Мальтыйскі крыж» (16+).**
**0.00** «Навіны апоўначы».
**0.35 Маст. фільм «Неразумная зорка» (12+).**
**2.25** «Іншы свет» (12+).
**2.55** «Любімыя акцёры 2.0». «Экіпаж» (12+).
**5.45 Серыял «АСА» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 20.40 Серыял «Пагоня за мінулым». (12+).**
**13.15** «Пакой смеху». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.20, 23.10 Серыял «Каменская». (16+).**
**0.15** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**0.35** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.40, 23.10** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Спецкар аддзела расследаванняў». (16+).**
**16.35 Серыял «Берагавая ахова». (16+).**
**19.45 Серыял «Высокія стаўкі. Рэванш». (16+).**
**21.25 Серыял «Адваротны адлік». (16+).**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Бальзакаўскі ўзрост, або Усе мужыкі — сво...» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.10, 19.35, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.15 Серыял «Амазонія» (12+).**
**9.00, 19.40 Серыял «Вецер, які малюе» (12+).**
**10.15** «Майстар-клас».
**10.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**11.00 Вестэрн «Касцяны тамагаўк» (16+).**
**13.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні» (16+).**
**14.30 Прыгоды «Гонкі па-італьянску» (12+).**
**16.15** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.20** «Мультпарад».
**17.00** «Сад і агарод».
**17.20 Серыял «Гром у раі» (16+).**
**18.45 Серыял «Абаронца» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Прыгоды «Піраты Эгейскага мора» (12+).**

### ВТБ

**6.00, 16.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20, 4.20** М/ф «Джынглікі». (0+)
**7.50, 4.45** М/ф «Тры каты». (0+)
**8.10, 5.00** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.30** «Ералаш». (6+)
**9.20, 1.50** Серыял «Гэта каханне». (16+).
**10.20** Фэнтэзі «Цёмны свет». (16+).
**12.25** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**13.00, 2.40** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**14.00, 20.00** «Супермамачка». (16+).
**15.10, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.10** «Уральскія пельмені». (16+).
**19.00** Серыял «Каманда Б». (16+).
**21.10** Фэнтэзі «Цёмны свет: раўнавага». (12+).
**0.00, 3.30** Серыял «Выжыць пасля». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Катрын Дэнёў.
**7.05** «Пешшу...» Масква студэнцкая.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.05, 22.45** «Пётр Першы. Завяшчанне». Серыял. (16+).
**9.00, 9.50, 12.45, 14.25, 15.10, 20.00, 21.35** Кінапаэзія.
**9.10, 21.40** «Хто мы?» «Ледзяны паход».
**9.35, 19.45** Галоўная роля.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.45** XX стагоддзе. «Махмуд Эсамбаеў». Дак. фільм.
**12.00, 1.35** Сусветныя скарбы.
**12.15** «Геній». Тэлевізійная гульня.
**12.55** «Саці. Нясумная класіка...»
**13.35, 20.45** «Зніклыя людзі — драматычная гісторыя эвалюцыі чалавека». Дак. фільм.
**14.30** Сведкі часу. «Заслужаны лайдак Расійскай Федэрацыі. Валерый Сіроўскі». Дак. серыял. Фільм 1-ы.
**15.15** Да 60-годдзя міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага. «Успамінаючы вялікія староні. Скрыпка».
**17.00** «Эрмітаж».
**17.25** «2 Вернік 2».
**18.20** «Атланты. У пошуках ісціны».
**18.45, 2.15** «Мой дом — мая слабасць». Дак. фільм.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**22.05** Штучны адбор.
**0.05** «Тым часам».
**1.50** Лаўрэаты XV Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага.

### Настальгія

**6.00** «Мантаж». 1989 год (16+).
**7.05** «Што? Дзе? Калі?» Другі паўфінал 1982 года (12+).
**8.15** «Вакол смеху». 1979 год (16+).
**9.45** Маст. фільм «Актыўная зона». (16+).
**12.05** «СевАлогія» з Севам Найгародцавым: «Кватэрная культура». 2005 год (18+).
**13.00, 14.40, 15.40, 17.00, 18.55, 20.45, 21.40, 23.00, 5.40** Музычная настальгія (12+).
**13.20** Маст. фільм «Позняя сустрэча». (16+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00, 0.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Як прымалі канстытуцыю». 2006 год (16+).
**19.30** Маст. фільм «Верыш, не верыш». (16+).
**23.15** Фільм-спектакль «Тэатральныя гісторыі». 1976 год (12+).
**1.05** «Ранішняя пошта». 1989 год (12+).
**1.35** Сустрэча ў канцэртнай зале «Расія» з Аляксеем Баталавым. 1989 год (12+).
**2.40** Дак. фільм «Сустрэча з Салжаніцыным». (12+).
**3.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Вясна». (12+).

### EuroSport 1

**3.30, 6.00, 9.00, 21.20** Снукер. The Players Championship.
**5.00** Веласпорт. Ціррэна—Адрыятыка.
**8.00, 14.00, 16.45, 2.30** Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі».
**10.30** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**11.35, 19.45** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**13.00** Веласпорт. Мілан—Сан-Рэма.
**15.00** Біятлон. Кубак свету.
**19.15** Футбол. «ФІФА».
**20.15** Конны спорт. Кубак свету.
**1.35** Аўтагонкі. Формула Е.

### Кінакамедыя

**1.20** Хлапечнік па-ірландску. (16+).
**3.20** Шоу «Камедыянты». (16+).
**3.50** Вялікая Афрадыта. (16+).
**5.40** Дзікая штучка. (16+).
**7.25** Інструкцыі не прыкладаюцца. (12+).
**9.50** Заліковы выкладчык. (16+).
**12.05** Дзявяць ярдаў. (18+).
**14.00** Самы лепшы тата. (16+).
**15.50** Хочаш ці не? (16+).
**17.30** Купі, займі, украдзі. (16+).
**19.30** 1 + 1. (16+).
**21.35** Між анёлам і чортам. (16+).
**23.40** Поўнае ператварэнне. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.00** «Доктар І...» (16+).
**8.30, 19.00, 1.45** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 3.10** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.50, 18.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**12.45** «Варажбітка» (12+).
**13.50, 4.40** «Паралельны свет» (12+).
**14.50** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.25** «Простыя складанасці» (12+).
**16.00** «Натуральны адбор» (12+).
**16.50** «Варажбітка» (12+).
**20.45** «Дзеці Вадаліва». Серыял (16+).
**21.55** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.50, 5.30** «Гісторыі выратавання» (16+).
**23.25** «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял (16+).
**0.15** «Закладніца». Трылер (16+).

### ТБ1000

**6.10, 16.25** Ва ўцёках (16+).
**8.05** Жонка астранаўта (16+).
**10.10** Выратаванне (16+).
**12.00** Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі (12+).
**14.10** Сёстры Магдаліны (16+).
**18.20** Хаціка — самы верны сябар (6+).
**20.10** Двое ў Сусвеце (16+).
**22.30** Вялікі куш (16+).
**0.30** Маладосць (18+).
**2.40** Гатака (12+).
**4.25** Як выкрасці хмарачос (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Падсадны.
**8.20** Чатыры таксісты і сабака (6+).
**10.25** Артыстка (12+).
**12.25** Застава Ільіча (Мне дваццаць гадоў). Серыя 1-я (6+).
**13.50** Адмірал (16+).
**16.20, 4.20** Два плюс два. 2—3-я серыі (12+).
**18.20** Дом на абочыне (16+).
**20.20** Напарнік (12+).
**22.20** Крыжаносец (16+).
**0.25** Паляўнічы-1. Чалавек з мінулага (16+).
**2.25** Прагулка (12+).

### National Geographic

**6.00** Супербудаванні. (12+).
**6.50, 18.00, 22.00, 1.00, 4.10, 5.40** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.35, 13.15** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.25, 11.40, 16.25, 20.20** Аўта-SOS. (12+).
**9.15** Джэйн. (16+).
**10.50** Найбуйнейшы ў свеце рамонт. (12+).
**12.25** Праз мільён гадоў. (12+).
**14.00** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**14.50** Найцяжэйшы ў свеце рамонт-2. (6+).
**15.35, 19.35, 0.15, 2.35** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.45, 22.45, 1.50** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала. (16+).
**23.30** Эвакуацыя Зямлі. (16+).
**4.55** Уварванне на Зямлю. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 15.30, 21.00, 3.25, 6.20** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Прыроджаныя механікі.
**14.00, 7.10** Выжыць любой цаной.
**15.00** Эканомім паліва.
**18.00, 0.00** Тыдзень хуткасці — 2018.
**19.00, 5.30** У пагоні за класікай.
**20.00, 1.00** Залатая ліхаманка.

## Тэлесеткі

# Памяці вогненных вёсак

**«Беларусь 3» пакажа цыкл фільмаў да 75-й гадавіны трагедыі Хатыні.**



20 сакавіка сацыякультурны канал прадставіць прэм'еру дакументальнага цыкла «Хатынь. Вайна без правілаў». У яго ўвайшлі чатыры серыі: «Падставы для маўчання», «Каты і ахвяры», «Мемарыял» і «Вогненныя пабрацімы Хатыні».

Аўтары праекта раскажуць пра гісторыю стварэння Хатынскага мемарыяла, прасочаць лёсы тых людзей, якія цудам выратаваліся ад гібелі, а таксама нагадаюць пра іншыя беларускія вёскі, зніклыя ў вогненнай прорве Вялікай Айчыннай. Разам з творчай групай пра важнасць захавання памяці для нашчадкаў паразважаюць гісторыкі і архівісты, філосафы, псіхолагі і сацыёлагі. У прыватнасці, падтрымку праекту аказалі загадчык аддзела ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксей Літвін, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіва Беларусі, укладальнік зборнікаў дакументаў «Хатынь. Трагедыя і памяць» Вячаслаў Селяменеў, дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» Артур Зельскі і іншыя.

# Спорт — як ён выглядае

**Вядучым новай праграмы на «Беларусь 5» стане вядомы расійскі спартыўны аглядальнік.**

На наступным тыдні нацыянальны спартыўны тэлеканал абяцае ўразіць беларускіх балельшчыкаў новым праектам «Кікнадзэ. Меркаванне». У аўтарскай праграме, створанай сумесна з тэлеканалам Саюзнай дзяржавы «БелРос», папулярны тэлевядучы Кірыл Кікнадзэ (аглядальнік і аўтар праграм на НТБ, «Матч ТБ») спалучыць свежую інфармацыю, аналітыку і фармат ток-шоу.



«Думаю, нашым гледачам будзе цікава пачуць кампетэнтнае меркаванне збоку, даведацца, як нашых спартсменаў успрымаюць на міжнароднай арэне, — мяркуе кіраўнік «Беларусь 5» Павел Булацкі. — І цалкам магчыма, што гэты свежы погляд падштурхне нас да новых крокаў у развіцці беларускага спорту».

Бягучыя спартыўныя і каляспартыўныя падзеі будзе ацэньваць і аналізаваць як сам вядучы, так і запрошаныя госці ў студыі, таму, як сцвярджаюць стваральнікі праграмы, яна будзе дынамічнай і разнапланавай. Першы выпуск «Меркавання...» гледачы ўбачаць ужо 23 сакавіка ў 11.45.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота прадстаўлена прэс-службай БТРК**

# ПРАДПРЫМАЛЬНАЕ РАМЯСТВО

**ДЛЯ адных гэта хутчэй хобі і дадатковы заробак. Другія ўсур'ёз лічаць, што любімая справа здольна пракарміць. Тры жыхары Маладзечанскага раёна падзяліліся сваімі гісторыямі.**

## Ад сурвэткі да сукенкі

У вёсцы, дзе расла Аляксандра Клімко, лічылася ганьбай, калі дзяўчына выходзіла замуж без пасагу, зробленага сваімі рукамі. У жанчыны да гэтага часу захоўваецца матчын саматканы абрус з карункавымі краямі. Унікальнай рэчы 80 гадоў, і Аляксандра Іосіфаўна кажа, што аднойчы перадасць яго ў спадчыну праўнучкам.



— Калі я расла, у вёсцы было вельмі цяжка жыць. Маці была занятая працай з ранку да вечара, так што пераймала навуку рукадзелля ад старэйшых суседскіх дзяўчат. Яны пасвілі кароў разам з малымі і бралі на поле дробную работу. Сядзелі, вязалі, а мы назіралі і стараліся запомніць узор. Схем жа тады не было, малюнак перадавалі па памяці, — успамінае жанчына.

Пасля вучобы ў тэхнікуме Аляксандра Іосіфаўна працавала аграномам, потым вывучылася на настаўніцу біялогіі. Пра рамяство ўспомніла, калі людзі зацікавіліся ручнымі вырабамі. Вязала адзенне для сябе, родных — адных толькі абрусаў зрабіла некалькі дзясяткаў.

На пенсіі з ніткамі і кручком працавала, хутчэй, пад ахвоту, бо з'явіўся лішні час. Пра тое, што ў Маладзечне існуе цэнтр рамёстваў, падказала адна з цяперашніх калег. Так Аляксандра Іосіфаўна стала ўдзельніцай клуба майстроў народнай творчасці «Вытокі». Як ні дзіўна, гэта няхітрае дзейства памяняла жыццё з «сядзячага» на больш актыўнае.

— Пенсіянер рэдка куды выбіраецца. Летам сядзіць у агародзе, зімою — перад акном. А мы з калегамі ад цэнтра рамёстваў выязджаем на фестывалі ды выстаўкі-кірмашы. Заўсёды цікава дазнацца нешта новае па культуры і гісторыі, пазнаёміцца з людзьмі. Важу вырабы з сабой, аднак прадаць удаецца не заўсёды. Куды часцей людзі проста разглядаюць і фатаграфуюць рэчы.

Калі майстрыца дазналася, што можна аформіць рамесніцкую дзейнасць, то проста пайшла ў падатковую інспекцыю і падала заяву. Для яе гэта быў шанц рэалізоўваць сваю прадукцыю.

На пытанне, ці можа рамесніцтва быць асноўным заняткам, Аляксандра Клімко адказвае, што многае залежыць ад попыту. У яе выпадку нельга разлічваць на стабільныя заказы, таму рамесніцтва, хутчэй падпрацоўка, работа «для душы». Напрыклад, цяпер работы зноў паменшала — прыйшоў чарговы спад цікаўнасці на вязаныя самаробныя рэчы, а ў іншы год заказвалі па некалькі рэчаў на месяц.

## Майстар па дрэве прыедзе дадому

У Генадзя Невядомскага іншая гісторыя. Рамеснікам працуе без малога год, гэта яго асноўны занятак і крыніца заробку.



Сам Генадзь родам з Мінска, але потым вярнуўся на малую радзіму ў вёску Шалыгі. Знайсці прыдатную вакансію па прафесіі ў сельскай мясцовасці не ўдалося, таму мужчына зарэгістраваўся як беспрацоўны ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Маладзечанскага райвыканкама. Месяц прачакаў прапановы наймальніка, аднак попыту на спецыяльнасць не было. Тады Генадзь вырашыў выкарыстаць веды на карысць уласнай справе.

— Я амаль усё жыццё займаўся дрэваапрацоўкай. На прадпрыемстве прайшоў шлях ад станочніка да начальніка вытворчасці, бачыў, як людзі будуюцца што ў Беларусі, што ў Расіі. Гэтыя назіранні і навялі на патрэбную думку. Цяпер дачнікі прыязджаюць у вёску не толькі дзеля агарода, але і на адпачынак. Значыць, патрэбны камфортныя ўмовы. На альтанкі, навесы, лаўкі, тэрасы павінен з'явіцца попыт.

Генадзь аформіў рамесніцкую дзейнасць і атрымаў субсідыю на развіццё справы. Да выдзеленых грошай даклаў свае сродкі і купіў універсальны дрэваапрацоўчы станок, які можна перавозіць у багажніку, шліфавальную машынку, дрыль, шрубавёрт — увесь ручны інструмент. Працуе ў адзіночку, бо заказы прыходзяць прыкладна раз на месяц. Зрэшты, гэта нават зручна, бо прыкладна такі ж тэрмін патрэбны, каб пабудаваць навес ці нескладаную альтанку. Фотаздымкі гатовых вырабаў Генадзь збірае ў «каталог паслуг», так кліенту прасцей выбіраць. Калі заказчык хоча нешта асаблівае, майстар пойдзе насустрач і абмяркуе параметры пабудовы.

— Я думаю, што ў гэтым якраз мая перавага перад буйнымі фірмамі, — разважае мужчына, — там стандартызаваны падыход, можна купіць толькі выраб, заяўлены вытворцам. А я працую па кожным заказе індывідуальна, сам устанаўліваю кошт. Трэба паступова развівацца, — лічыць Генадзь. — Пакуль заказаў няшмат, буду працаваць як рамеснік. Калі адчую, што попыт расце, пачну думаць аб тым, каб пераафарміць дзейнасць.

## «Спрабую прадбачыць няштатныя сітуацыі»

Маладая прадпрымальніца Валерыя Шастак раней была аператарам у турыстычнай фірме, але працу даводзілася часта мяняць — не задавальнялі ўмовы. Звольніўшыся чарговы раз, Валерыя трапіла ў спіс беспрацоўных. Пасля месяца пошукаў спецыялісты з упраўлення па занятасці параілі ёй задумацца над арганізацыяй уласнага бізнесу.



— Трэба сказаць, мара пра ўласную справу існавала даўно, а тут так шчасліва склаліся абставіны. Самым складаным было паверыць, што ўсё гэта рэальна і можна насамрэч адкрыць турыстычную фірму, так што да апошняга чакала непрыемнасцяў. Аднак перашкод не ўзнікла. Мне дапамаглі скласці бізнес-план, выручыў і папярэдні вопыт работы ў невялікіх фірмах, дзе ўвесь дакументаабарот навідавоку.

Валерыя пачала працу з канца мінулага года. Атрымала субсідыю ў снежні і за студзень паспела купіць неабходнае абсталяванне, наладзіць сувязі. У прынцыпе, турыстычны бізнес не патрабуе вялікіх фінансавых затрат, так што за асабістыя сродкі набывала толькі рэкламу, вывеску і канцылярскія прылады. У лютым кліент падпісаў першы дагавор з новым індывідуальным прадпрымальнікам...

— Зразумела, заўсёды ёсць рызыка, што падчас тура адбудзецца нейкая непрыемнасць, якую ты не зможаш папярэдзіць, і кліент расчаруецца ў паслузе. Таму перад адпраўленнем тлумачу ўсе нюансы вандроўкі, спрабую прадбачыць магчымыя няштатныя сітуацыі. Затое ў паездку турысты адпраўляюцца маральна падрыхтаванымі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

**20 апреля 2018 г. ИЗВЕЩЕНИЕ №4-А/2018**

**о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Район индивидуальной жилой застройки «Красный Маяк» по ул. Кленковской, 92 (участок № 267 по генплану) | 321089204601000138 | 0,0843 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Ограничений в использовании нет | 99 | 6 204,71 | 200,00 | 1 950,40 |
| 2 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 331 по генплану) | 340100000008002256 | 0,0809 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Ограничений в использовании нет | 99 | 5 472,60 | 200,00 | 1 787,26 |
| 3 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 787 по генплану) | 340100000008002985 | 0,0855 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Охранная зона линий связи и радиофикации, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы | 99 | 5 818,08 | 200,00 | 1 847,95 |
| 4 | По ул. Жукова | 340100000006005524 | 0,1241 | Для строительства и обслуживания бесконтактной мойки самообслуживания | Водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона сетей и сооружений канализации | 5 | 3 926,29 | 200,00 | 2 642,20 |
| 5 | По ул. Григория Деенисенко (район жилого дома № 38) | 340100000006005523 | 0,0016 | Для размещения легкотипного торгового павильона | Водоохранная зона рек и водоемов | 5 | 199,40 | 10,00 | 3 080,09 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6).
3. **Аукцион состоится 20 апреля 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
Необходимые документы:
4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 19 марта по 18 апреля 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6.**

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

## Пётр НІКІЦЕНКА:

# «ДЗЕ Б НІ БЫЎ, ЦЯГНУЛА ДАДОМУ»

**З акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктарам эканамічных навук, прафесарам, экспертам Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН па інавацыйным развіцці, стваральнікам беларускай міжнароднай навуковай школы інавацыйнага і наасфернага ўстойлівага развіцця Пятром НІКІЦЕНКАМ пра ўзаемааднасіны чалавека і яго малой радзімы гутарыць наш карэспандэнт.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Пётр Георгіевіч, на гэту тэму ўжо шмат сказана. І адказаў на пытанне — адкуль у беларусаў настальгія па бацькоўскім доме, родных мясцінах — таксама дастаткова. Ці не здаецца вам, што ў Год малой радзімы мы рызыкуем апынуцца ў палоне рамантычных успамінаў, бясконцых размоў пра юнацтва, першае каханне, рачулку за вёскай, яблыневы сад каля вясковай школы і г. д.?***

— Такая рызыка ёсць. Тэматычная накіраванасць 2018 года міжволі падштурхоўвае да гэтага. Прызнаюся, перад сустрэчай з вамі я, нібы на машыне часу, перанёсся ў далёкія пасляваенныя гады. Як дзіця вайны, я разам са сваім народам прайшоў праз усе выпрабаванні і цяжкасці аднаўлення разбуранай ушчэнт Віцебшчыны. Мае ўспаміны не заўсёды рамантычныя: кінутыя салдацкія акопы ў агародзе, пах лебяды і крапівы ў ежы, палонныя немцы, якія адбудоўвалі Віцебск, прымітыўныя самаробныя цацкі, раскіданыя паўсюль гільзы патронаў... Але было і цікавае, і прыемнае ў тым юнацтве. Памятаю свой першы працоўны заробак 16-гадовага электразваршчыка, сяброў, суседзяў...

> «Лічу, што рэзервы самазанятасці насельніцтва невялікіх пасёлкаў і вёсак у нашых рэгіёнах далёка не вычарпаныя. Людзям часам трэба дапамагчы наладзіць рэнтабельную пэўную справу, падбадзёрыць, нешта падказаць».

Я і сёння моцна адчуваю повязь з роднымі мясцінамі, часта бачу ў снах Заходнюю Дзвіну. Упэўнены, у большасці маіх суайчыннікаў часта ўзнікаюць падобныя цёплыя пачуцці. І гэта па-чалавечы зразумела. Аднак эмацыянальны аспект тэмы малой радзімы, рамантычныя ўспаміны аб ёй усё ж, на мой погляд, не павінны быць галоўным зместам праведзення Года, засланяць ад нас тыя непазбежныя працэсы, што адбываюцца на абсягах нашай і суседніх краін. І ў Год малой радзімы нам варта на гэта звярнуць увагу.

***— Канкрэтызуйце, калі ласка, пра што ідзе гаворка.***

— Рэаліі жыцця такія, што ў Беларусі працягваецца непадуладныя нам працэсы ўрбанізацыі. Ад яе не схавацца, не абараніцца, яе не спыніць, як бы мы ні імкнуліся, ні сумавалі праз паступовае знікненне маленькіх маляўнічых вёсачак, якія для многіх гараджан з'яўляюцца малой радзімай. Аб'ектыўны працэс павышэння ролі гарадоў, павелічэння колькасці іх насельніцтва, узрастанне ўплыву гарадской культуры і так званых не заўсёды станоўчых гарадскіх адносін — фактар аб'ектыўны. Урбанізацыя, як сёння кажуць, трэнд развіцця грамадства, і мы міжволі рухаемся ў гэтым кірунку. Аднак гэта не значыць, што мы павінны стаць у позу пасіўнага назіральніка. Нашы рэсурсы варта скіраваць у цэлым на развіццё тэрыторый рэгіёнаў, каб забяспечыць годнае жыццё іх жыхароў. Дарэчы, пра гэта днямі заявіў кіраўнік дзяржавы ў час справаздачы ўрада, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама аб выніках працы эканомікі краіны за 2017 год і задачах па забеспячэнні далейшага ўстойлівага эканамічнага росту. А гэта велізарная праца, суцэльны комплекс пытанняў, у тым ліку і навукова-тэхналагічных, вырашэнне якіх зойме не адзін год.

Падтрымліваць жыхароў вёсачак трэба, як і рэдкіх перасяленцаў туды з горада, якіх, дарэчы, з часам становіцца ўсё больш. Але ў вялікім маштабе дэзурбанізацыя нам не пагражае, перспектыва ўсё ж за буйнымі аграгарадкамі, дзе лепш за ўсё спалучаюцца выгоды горада і перавагі жыцця на прыродзе.

***— Цяжка з вамі не пагадзіцца, але далёка не ўсюды назіраецца ўдалае спалучэнне гарадскіх выгод і радасцяў сельскага жыцця. Нават знешне. На што трэба звярнуць увагу мясцовай уладзе падчас рэалізацыі задач Года малой радзімы? Як суадносіцца з гэтымі задачамі пачатая некалькі гадоў назад работа па навядзенні парадку на зямлі?***

— Думаю, самым непасрэдным чынам. Нядаўна адбыліся выбары, у мясцовыя Саветы дэпутатаў прыйшло шмат новых энергічных прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва. Гэта сіла, якую варта актывізаваць. У тым ліку і праз далейшае прыняцце законаў і заканадаўчых актаў па разняволенні дзелавой ініцыятывы, рэфармаванні грашова-падатковай сістэмы. Яе, дарэчы, трэба зрабіць не толькі адзінай для ўсіх удзельнікаў рынкавых адносін, але і змяніць сістэму размеркавання падаткаў — каб значную іх частку пакідаць на патрэбы развіцця тэрыторый. Карацей, каб людзі сталі сапраўднымі гаспадарамі сваёй зямлі з дастойнай заработнай платай і на сабе адчулі станоўчыя змены ў іх жыцці.

***— Вядома, стварэнне новых працоўных месцаў, павышэнне зарплаты, ліквідацыя беспрацоўя — першачарговыя мэты дзейнасці мясцовай улады. Але паўсюдна ёсць шмат «дробных» пытанняў, якія перашкаджаюць нармальнаму жыццю людзей і чамусьці не вырашаюцца гадамі...***

— Такіх фактаў, на жаль, больш чым дастаткова. Вырашэнне «дробных» праблем часам не патрабуе вялікіх арганізацыйных намаганняў і значных сродкаў — дастаткова іх ашчадна і мэтанакіравана выкарыстоўваць. Я ўвогуле параіў бы абноўленым раённым Саветам дэпутатаў неадкладна заняцца распрацоўкай уласнай стратэгіі развіцця мясцовай эканомікі і сацыяльнай сферы. А такіх разгорнутых планаў з падключэннем усіх формаў уласнасці, на жаль, не хапае. На што таксама звярнуў увагу Прэзідэнт у ходзе вышэйназванай справаздачы ўрада. Зразумела, Саветам у іх рабоце неабходна будзе пазбегнуць манілаўшчыны, цвяроза зыходзіць са сваіх магчымасцяў. Напрыклад, я лічу, што рэзервы самазанятасці насельніцтва невялікіх пасёлкаў і вёсак у нашых рэгіёнах далёка не вычарпаныя. Людзям часам трэба дапамагчы наладзіць рэнтабельную пэўную справу, падбадзёрыць, нешта падказаць.

Давайце паглядзім, а ці ў дастатковай ступені мясцовая ўлада садзейнічае развіццю малога прадпрымальніцтва, пашырэнню надомнай працы? Вось тут ёсць шанцы праявіць сябе кожнаму Савету. Чаму не разгледзець гэтае пытанне на чарговай сесіі райсавета, не распрацаваць канкрэтны і рэальны план дасягнення пастаўленых мэт?

Ад новых дэпутатаў людзі чакаюць канкрэтных спраў. Няхай гэта будзе ўдасканаленне дарожнай інфраструктуры, будаўніцтва спартыўных і дзіцячых пляцовак, стварэнне веласіпеднай дарожкі, добраўпарадкаванне старога парку, адкрыццё новага сквера, сумесны з жыхарамі шматпавярховых дамоў клопат аб чысціні і камфорце дваровых тэрыторый і г. д. Увогуле, надышоў час стварыць у краіне Фонд эканамічнай абароны насельніцтва на выпадак складаных абставін. Удзел дэпутатаў у яго рабоце мне бачыцца абавязковым.

***— Вернемся да тэмы Года малой радзімы. Што для вас асабіста гэта азначае?***

— Маё жыццё, лічу, склалася ўдала. Займаўся і займаюся любімай справай, чагосьці дасягнуў, наведаў усе кантыненты, шмат краін, купаўся, як гаворыцца, ва ўсіх акіянах. Але куды б ні закідваў мяне лёс, больш за два тыдні там не магу знаходзіцца. Прабачце за пафас, але Беларусь клікала дамоў. Настальгія па радзіме не пусты гук для мяне. Прыемна, што і мяне памятаюць у родных мясцінах, падтрымліваюць сувязі са мной.

***— Якая, на ваш погляд, выхаваўчая значнасць такога Года?***

— Яго галоўны сэнс заключаецца, на маю думку, у актывізацыі работы па патрыятычным выхаванні, фарміраванні светапогляду маладых людзей. У гэтай сувязі Год дае магчымасць азірнуцца, паспрабаваць па-новаму паглядзець на повязь пакаленняў, даць юнакам і дзяўчатам магчымасць адчуць сябе патрыётамі. Маладое пакаленне, якое прыходзіць да кіравання краінай ва ўсіх сферах, трэба недакучліва вучыць цаніць працу сваіх папярэднікаў, іх унёсак у развіццё эканомікі, сацыяльнай і іншых сфер. Тут важную ролю могуць і павінны адыграць мясцовыя краязнаўчыя музеі. Іх сціплую дзейнасць цяжка пераацаніць. Супрацоўнікі музеяў, якія звычайна падтрымліваюць сувязі са сваімі знакамітымі землякамі, захоўваюць у экспазіцыях выставачных залаў гістарычную памяць аб тутэйшых ураджэнцах... Сёння відавочна, што ў беларускім грамадстве ўсё больш усведамляюць першаснасць рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў краіны — і менавіта праз развіццё ўсіх яе тэрыторый.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

СЕЗОН

# ЧАС БЯРОЗАВІКУ!

## Нарыхтоўваем сок правільна

**У эфіры тэлеканала СТБ выйшла інтэрв'ю кансультанта аддзела рэалізацыі лесапрадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Аксаны Петрулевіч. Спецыяліст расказала аб правілах збору бярозавага соку.**

Як адзначыла Аксана Петрулевіч, традыцыйнымі тэрмінамі збору соку з'яўляюцца сакавік і красавік. Менавіта ў гэты перыяд, як правіла, устанаўліваецца плюсавая тэмпература і пачынаецца рух соку. Спыняецца ён пасля распускання пупышак на дрэвах.

Спецыяліст таксама дадала, што для нарыхтоўкі сокаў лясгасамі вызначаюцца ўчасткі насаджэнняў з пэўнымі характарыстыкамі, напрыклад, дыяметр бярозы павінен быць не менш за 20 сантыметраў. Важную ролю адыгрывае і ўзрост дрэва: нарыхтоўваць сок можна не раней чым за пяць гадоў да наступлення ўзросту рубкі. Для збору дапускаецца выкарыстанне любога інструмента, якім можна прасвідраваць канал, з патрабаваннямі, адпаведнымі правілам нарыхтоўкі соку. Дапускаецца таксама прапіл бензапілой, калі ён уяўляе сабой касы зрэз пад вуглом не больш за 30° ад вертыкальнай восі, даўжынёй не больш за 12 сантыметраў і глыбінёй не больш за 4 сантыметры без уліку таўшчыні кары.

Нарыхтоўку соку фізічным асобам можна весці на ўчастках лясного фонду, якія вызначаны для гэтых мэт юрыдычнымі асобамі, што вядуць лясную гаспадарку, іх структурнымі падраздзяленнямі (лясніцтвамі) бясплатна і без дазвольных дакументаў. Інфармацыя пра месца знаходжання такіх участкаў лясного фонду размяшчаецца на афіцыйных сайтах юрыдычных асоб, якія вядуць лясную гаспадарку, у СМІ і іншых крыніцах. Таксама грамадзяне могуць набыць бярозавы сок, нарыхтаваны работнікамі лясгасаў. У гэтым сезоне лесагаспадарчыя ўстановы краіны плануюць сабраць каля 16 тысяч тон карыснага напою.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


### Извещение о проведении 25 апреля 2018 года торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)** | Капитальное строение (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад обменного фонда), общей площадью 479,1 кв. м с инв. № 613/С-13667, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, Игрущковский с/с, д. Каменка, ул. Мелиоративная. 2/3, Республика Беларусь на земельном участке с кадастровым номером 623082003101000121 |
| **Начальная цена** | 29 593,80 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 2 959,38 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, (017) 327-05-62 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 25 апреля 2018 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 19.03.2018 по 20.04.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»

З ЧАГО ПАЧАЦЬ?

# КАБ СРОДКІ НЕ РАСПЫЛЯЦЬ,

## або Творчасць на службе ў добраўпарадкавання

**МАЛАЯ радзіма пачынаецца з парадку на зямлі. Прычым калі аб ім дбаюць не толькі мясцовыя ўлады, але і арганізацыі, прадпрыемствы, жыхары. Талакой можна зрабіць родны куток яшчэ больш прыгожым, утульным і камфортным для жыцця і адпачынку. Менавіта так лічыць старшыня Клецкага раённага Савета дэпутатаў Святлана ЧАКУН.**

— Цяжка паверыць, але там, дзе калісьці былі закінутыя мясціны, цяпер добраўпарадкаваныя зоны адпачынку. Там, дзе ў нас стаялі непрывабныя пустуючыя дамы, зелянее ніва, — прызнаецца Святлана Уладзіміраўна. — За апошнія 10 гадоў знесены 1435 дамоў. Радасна і разам з тым сумна. Хочацца, каб вёскі жылі, каб тут звінелі дзіцячыя галасы. Але рэальнасць такая, што сельскае насельніцтва старэе, дэмаграфічная сітуацыя пагаршаецца. Тым не менш трэба, каб нашым людзям, нават у малакалькасных аддаленых вёсках, жылося зручна, камфортна. Каб на малую радзіму прыемна было вяртацца тым, хто адсюль даўно з'ехаў.

Штогод у Клецкім раёне зносяць больш як 150 пустуючых і старых домаўладанняў і прыцягваюць у сельскагаспадарчы абарот звыш 100 гектараў зямлі. Навялі парадак у адным населеным пункце — бяруцца за іншы. Прычым падключаюць да справы ўсе арганізацыі і прадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі сельсавета, мясцовых жыхароў.

Сваю ролю ў плане добраўпарадкавання адыгралі і раённыя конкурсы на найлепшы сельсавет і орган тэрытарыяльнага самакіравання. Вынікі іх падводзіліся на раённым святе працы, пераможцы атрымлівалі прэміі... Але тры гады таму фармат конкурсаў змяніўся. Цяпер, каб паўдзельнічаць у іх, трэба прадставіць у аўтарытэтную камісію творчы праект і абараніць яго, даказаць, што ён найлепшы сярод іншых.

Зразумела,на рэалізацыю трох самых лепшых творчых работ у раённым бюджэце прадугледжаны сродкі: за першае месца — 800, другое — 600 і трэцяе — 400 базавых велічынь. Разам з тым пераможцы далучаюць да справы дэпутатаў, жыхароў, прадпрыемствы і арганізацыі, прыватныя структуры, спонсараў. У выніку пачынаючы з 2014-га кожны год у раёне з'яўляюцца як мінімум тры акультураныя, уладкаваныя мясціны — тры часцінкі роднай зямлі.

Напрыклад, толькі ў 2015 годзе ў аграгарадку Сіняўка на месцы звалкі зрабілі надзвычай цікавы аб'ект «Крыніца». Тэрыторыю акультурылі, праклалі дарожкі, устанавілі малыя архітэктурныя формы, лаўкі. Здаўна бытуе павер'е, што ў гэтай крыніцы гаючая вада, па якую едуць людзі з Клецка, суседніх раёнаў і абласцей... У тым жа Сіняўскім сельсавеце каля вёскі Нарэшавічы добраўпарадкавалі «Лебядзіны востраў». На беразе возера можна цудоўна адпачыць: тут ёсць душавыя кабінкі, мангалы, лаўкі, пляцоўка для правядзення розных свят, стаянка для аўтатранспарту... У аграгарадку Даматканавічы паміж будынкам сельвыканкама і Домам культуры з'явілася зона, абсталяваная ўсім неабходным для адпачынку дзяцей і дарослых. У аграгарадку Грыцэвічы пабудавана шматфункцыянальная пляцоўка, якую па меры неабходнасці можна выкарыстоўваць для правядзення кірмашоў, масавых мерапрыемстваў, у якасці аўтастаянкі.

Па-сапраўднаму здзіўляе парк у аграгарадку Янавічы. Зона адпачынку з альтанкамі, прыгожыя асфальтаваныя дарожкі, вялікая клумба, гульнявая пляцоўка для дзяцей з арэлямі, валейбольная пляцоўка, сцэна з амфітэатрам для выступленняў артыстаў. Парк названы ў гонар Героя Сацыялістычнай Працы, вядомага на ўсю краіну былога старшыні племзавода «Чырвоная зорка» Іосіфа Іосіфавіча Плаўскага. На ўваходзе — памятная дошка з яго партрэтам.

У гэтым знакавым месцы мы прызначылі сустрэчу **старшыні Красназвёздаўскага сельвыканкама Рыгору МАСЛО.**

— Парк закладзены ў 1989 годзе ў гонар 50-гадовага юбілею прадпрыемства, — увёў у курс справы Рыгор Іванавіч. — Пасадачны матэрыял бралі ў мінскім батанічным садзе, а ўсяго тут налічваецца трыццаць відаў дрэў. У 2016-м наш сельсавет заняў першае месца ў конкурсе праектаў па добраўпарадкаванні сельскіх населеных пунктаў і атрымаў прэмію 800 базавых велічынь. Гэта дало магчымасць зрабіць зялёную зону камфортнай для адпачынку і прыгоднай для правядзення розных мерапрыемстваў.



У канцы мінулага года камісія таксама вызначыла тры найлепшыя праекты. Іх аўтары задумалі зрабіць нешта арыгінальнае, не падобнае да таго, што было рэалізавана іх калегамі ў папярэднія гады. Такім чынам, у парку аграгарадка Кухчыцы высадзяць зялёны лабірынт. А ў аграгарадку Шчэпічы мяркуецца размясціць... сем цудаў свету.

— Мы імкнёмся, каб у сельскай мясцовасці людзі жылі не горш, чым у горадзе, каб былі забяспечаны ўсімі сацыяльнымі дабротамі. Нядаўна газіфікавалі аграгарадок Заастравечча. Сёлета ў планах правесці газ у аграгарадку Морач. У найбліжэйшай перспектыве «блакітнае» паліва прыйдзе ў аграгарадок Лазавічы, — расказаў **старшыня Клецкага райвыканкама Аляксандр ЛОМСКІ**. — На вёсцы ненармаваны рабочы дзень, цяжкая праца. А яшчэ трэба рана падняцца, каб расталіць у печы, прыгатаваць дзецям снеданак ды адправіць іх у школу... Таму ўваходзім у становішча вяскоўцаў, імкнёмся ствараць для іх камфорт.

Акрамя таго, апошнім часам мясцовыя ўлады робяць акцэнт на актыўным будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах — там, дзе ёсць попыт. Пытанне пакуль аналізуецца, вывучаецца.



Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

ТЭХНАЛОГІІ Ў БЫЦЕ

# «КАНСЬЕРЖКА» Ў СМАРТФОНЕ,

## ці Як аб'яднаць усіх жыхароў дома

**Сучасныя тэхналогіі ўсё шчыльней уваходзяць у наша жыццё, закранаючы і тыя сферы, якія здаваліся ад іх надзвычай далёкімі. Напрыклад, раней, каб атрымаць інфармацыю пра жыхароў дома, можна было звярнуцца да ўсюдыіснай кансьержкі або адной з суседак, якая добраахвотна брала на сябе гэтую функцыю. Зараз жа гэтыя задачы паспяхова можа вырашыць адмысловая праграма — чат-бот. Паспрабуем разабрацца, што гэта такое і для чаго патрэбна, на рэальным прыкладзе.**



Чат-бот «Дамавік», як і ўсе добрыя праекты, з'явіўся дзякуючы жыццёвай неабходнасці. Яго **стваральнік Максім УСАЧОЎ** рыхтаваўся да пераезду ў сваю кватэру ў навабудоўлі. Прыйшоў час, калі паўстала патрэба суседзям знаходзіць адно аднаго дзеля абмену важнай інфармацыяй і рашэння праблемных пытанняў адносна дома. Звычайна ўсё пачынаецца з форуму на якім-небудзь вядомым рэсурсе. Але потым настае момант, калі «зносін» на форуме перастае хапаць, хочацца больш інтэрактыўнага ўзаемадзеяння, і людзі ствараюць групу ў сацыяльных сетках і пераходзяць туды.

Максім узяў ініцыятыву ў свае рукі, стварыў групу ў адным з найбольш папулярных месенджараў — Telegram, і пачаў запрашаць туды будучых суседзяў. Людзей у групе станавілася ўсё больш, узнікла неабходнасць весці ўлік жыхароў, каб разумець, хто адкуль. Так з'явіўся і бот.

З тэхнічнага пункту гледжання рэалізаваць гэта для Максіма не склала цяжкасцяў, праграміст і раней займаўся распрацоўкай ботаў, так што ў яго былі неабходныя ўменні. Менавіта такі фармат узаемадзеяння з суседзямі малады чалавек выбраў таму, што месенджар ёсць у большасці людзей, якія карыстаюцца смартфонамі. Плюс да ўсяго, гэта зручна, бо ў адным месцы захоўваецца ўся неабходная інфармацыя: фатаграфіі дома, спасылкі на карысныя дакументы, кантакты суседзяў і абслуговых арганізацый. Бот вядзе базу даных жыхароў усяго дома. Знайсці кантакты суседзяў можна, напрыклад, па нумары кватэры, тэлефоне ці нумары аўтамабіля. І больш не трэба вывешваць неэстэтычныя аб'явы на дзвярах пад'езда.

Па словах Максіма Усачова, каментарыі жыльцоў у асноўным станоўчыя. Пытанні ўзнікаюць толькі ў людзей старэйшага ўзросту, якія не так добра знаёмыя з сучаснымі тэхналогіямі. Звычайна цікавяцца, што такое бот, як ім карыстацца, дзе захоўваюцца персанальныя даныя і гэтак далей. Што датычыцца прапаноў па ўдасканаленні праграмы, то часцей за ўсё яны тлумачацца асаблівасцямі дамоў. Напрыклад, у першай версіі бот не мог абслугоўваць шматсекцыйныя дамы — гэта калі адзін дом падзелены на секцыі, у кожнай з якіх па некалькі пад'ездаў. Зараз гэтая праблема вырашана.

Каб з ботам маглі разабрацца ўсе ахвотныя, Максім імкнецца зрабіць яго максімальна простым. На любое ваша пытанне, няхай гэта будзе тэлефон ліфтавай службы або імёны суседзяў па лесвічнай клетцы, праграма адкажа ў гутарковай форме.

— На дадзены момант, лічу, што бот валодае дастатковай функцыянальнасцю, каб вырашаць асноўныя праблемы жыхароў новабудоўляў. Пакуль у мяне скончыліся ідэі, як яго яшчэ можна ўдасканаліць, таму буду чакаць прапаноў збоку, — з усмешкай прыкмячае Максім.

Ініцыятыва распрацоўніка хутка перайшла выключна з яго дома на іншыя. На дадзены момант бот абслугоўвае больш за 70 новабудоўляў, прычым, як з Беларусі, так і з Расіі. Карыстанне праграмай абсалютна бясплатнае. Знайсці бот можна, увёўшы ў пошук @damavikbot.

**Дар'я КАСКО.**

# КУДЫ ГЛЯДЗЯЦЬ АГЛЯДНЫЯ КАМІСІІ?

## У Магілёве далі ацэнку іх рабоце

**Трывожная статыстыка па пажарах у першыя месяцы года прымусіла ратавальнікаў, следчых і пракурорскіх работнікаў кансалідавацца і выпрацаваць агульную стратэгію дзеянняў. Падчас круглага стала, які адбыўся ў Магілёве, была прааналізавана і роля грамадскасці ў папярэджванні няшчасных выпадкаў. Выказваліся некаторыя заўвагі і накont работы агляднх камісій. Недахопы высветліліся падчас праверкі пракуратурай ступені гатоўнасці сельскіх Саветаў, іншых органаў мясцовай улады, прадпрыемстваў і арганізацый да абароны насельніцтва ад пажараў.**

— Работу аглядных камісій нельга пераацаніць, яны шмат чаго робяць для прафілактыкі пажараў. Але, на жаль, ёсць і негатыўныя прыклады, калі прысутнічае пэўная доля фармалізму, — адзначыў **пракурор аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Дзяніс ХМЯЛЬКОЎ.** — Дастаткова згадаць справаздачу Паршынскага сельвыканкама Горацкага раёна, дзе было напісана, што летась усе 656 дамоў, якія там зарэгістраваныя, былі абследаваныя на прадмет супрацьпажарнай бяспекі. На самай справе выявілася, што гэта не так. Жыллё аднаго з жыхароў сельсавета, інваліда 1-й групы па зроку, правяралі апошні раз у 2016 годзе, а дом яшчэ аднаго вяскоўца, інваліда 2-й групы, наогул наведвалі ў 2015 годзе. Аналагічныя факты выяўлены ў Кіраўскім, Крычаўскім, Круглянскім, Шклоўскім, Мсціслаўскім раёнах.

Пры праверцы высвятляліся таксама парушэнні тыповага Палажэння аб умовах і парадку правядзення аглядаў супрацьпажарнага стану дамоў. Напрыклад, у камісіях Горацкага і Шклоўскага раёнаў адсутнічалі спецыялісты па энергетычным і газавым наглядах. А ў камісіях Ленінскага і Аўсянкаўскага сельвыканкамаў Горацкага раёна не аказалася прадстаўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду.

Не ўсюды аглядныя камісіі ўзаемадзейнічаюць з іншымі суб'ектамі прафілактыкі. Напрыклад, камісія Трасцінскага сельвыканкама тройчы наведвала грамадзяніна з вёскі Яноўка, які груба ігнараваў тэхніку супрацьпажарнай бяспекі. Трывогу выклікалі скразныя расколіны ў яго печцы, адсутнасць запорнага прыстасавання на пячных дзверцах. Мужчыну прымушалі выправіць недахопы, правяралі, але выключна на грамадскім узроўні. Інфармацыя пра грубыя парушэнні Хоцімскаму раённаму аддзелу НС нават не перадавалася. На момант праверкі жылля гэтага вяскоўца пракурорскімі работнікамі шмат парушэнняў так і не было выпраўлена.

Некаторым аглядным камісіям не хапае ўвагі да сваіх землякоў з абмежаванымі магчымасцямі. У інвалідаў 1-й і 2-й груп не заўсёды знаходзяцца грошы на рамонт сваіх печак. А праваралынічыкі не заўсёды звяртаюцца ва ўстановы сацыяльнага абслугоўвання з просьбай дапамагчы гэтым людзям ліквідаваць недахопы.

Бывае, што члены аглядных камісій не толькі не клапоцяцца пра лёс сваіх, можна лічыць, суседзяў, але і не ведаюць, хто яшчэ ўваходзіць у склад камісіі. Такі факт быў выяўлены ў Круглянскім раёне.

Ёсць недахопы не толькі ў рабоце аглядных камісій, але і ў дзеяннях адказных за супрацьпажарную бяспеку спецыялістаў ад мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў, арганізацый.

— Супрацоўнікі гаррайаддзелаў па НС накіроўваюць па месцы працы парушальнікаў або іх родным інфармацыю, каб яны паўплывалі на тых, хто ігнаруе правілы бяспекі. Але яе не заўсёды прымаюць да ведама. У выніку адбываюцца няшчасныя выпадкі, якіх можна было б проста пазбегнуць, — сведчыць Дзяніс Хмялькоў. — У раёнах шмат чаго робіцца для таго, каб прадухіліць пажары, але не заўсёды праводзяцца планавыя якасныя поўнамаштабныя агляды супрацьпажарнага стану. І гэта, на жаль, негатыўна адбіваецца на абстаноўцы. Калі падыходзіць да праблемы адказна, не ігнараваць патрабаванні ратавальнікаў, больш уважліва ставіцца да сваіх суайчыннікаў, менш будзе чорных фарбаў у нашым жыцці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ВУЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ ПІЛЬНАСЦІ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Колькі пішацца-гаворыцца, колькі ўчастковыя праводзяць прафілактычных гутарак, супрацоўнікі сельсаветаў нагадваюць пра пільнасць, а прыкрыя выпадкі паўтараюцца зноў і зноў. Праўда, цяпер многія ўсё ж пра бяспеку дбаюць. У вёсцы Залескі Кобрынскага раёна давялося бачыць такую карціну. Для таго каб 85-гадовая бабулька выйшла з хаты, яе маладзейшая суседка бярэ кій і стукае ў сцяну пад акном: падае ўмоўны сігнал. Але тут не даводзіцца здзіўляцца, адна з апошніх жыхарак названай вёскі некалі працавала ў ахове на залатых рудніках, бабулька яшчэ той загартоўкі. Некаторыя пенсіянеры строга папярэджаныя дзецьмі, нізавошта не адчыняюць незнаёмцу. Іншыя ж... Ну не прывыклі нашы людзі зачыняцца на ўсе замкі. Тым больш старыя, якім часта не хапае жывога слова. Вось і пускаюць, гатовыя знайсці шчырага суразмоўніка.

## Старыя метады

Вось і нядаўна да 86-гадовай жыхаркі Баранавічаў зайшлі жанчыны і адрэкамендаваліся работніцамі сацыяльнай службы. Пакуль адна распытвала жанчыну пра памер пенсіі, стан здароўя, праблемы і патрэбы, другая ўмудрылася знайсці бабуліну схованку з грашыма і ўкрала 380 рублёў. Махляркі наведалі пенсіянерку яшчэ 25 студзеня, але злачынства ўсё яшчэ не раскрытае. Калі не ўдалося зрабіць гэта па гарачых слядах, то потым знайсці зламысніка вельмі цяжка, яны «працуюць» надзвычай асцярожна.

Праўда, у Столінскім раёне махлярам не пашанцавала.

Да 75-гадовага жыхара вёскі Рэмель зайшлі тры жанчыны. Візіцёркі загаварылі пра ўраджай, паведамілі, што хочуць купіць бульбу. Схема тая ж: пакуль адна адцягвала ўвагу гаспадара, саўдзельніцы шнарылі па хаце. І змаглі знайсці зберажэнні: 3050 долараў і 3000 рублёў. Добра, што дзядуля хутка звярнуўся ў міліцыю. Сумеснымі намаганнямі супрацоўнікаў міліцыі Брэсцкай і Гомельскай абласцей махляры былі затрыманыя, грошы канфіскаваныя і вернутыя гаспадару. Цяпер рэмельскі пенсіянер, трэба думаць, і дзясятаму закажа.

## І зноў прафілактыка

**Старшыня Шаняўскага сельскага Савета дэпутатаў Пружанскага раёна Сяргей ЛАПУКА** — былы супрацоўнік міліцыі. Сяргей Іванавіч гаворыць:

— Даўно ўпэўніўся, што найлепшая прафілактыка — гэта індывідуальная гутарка. Вядома, мы і сходы праводзім, і розную інфармацыю размяшчаем у магазінах, іншых грамад-



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

скіх месцах. Усё гэта важна. Але найлепш пагаварыць з умоўнай Марыяй Пятроўнай, расказаць ёй пра канкрэтныя выпадкі падманаў і папярэдзіць, што адчыняць незнаёмцам ні ў якім разе нельга. Супрацоўнікі раённых службаў павінны мець пры сабе і прад'яўляць дакументы. А тыя ж работнікі аддзела сацыяльнай абароны, якімі любяць рэкамендавацца махляры, ездзяць у нас у суправаджэнні прадстаўнікоў сельвыканкама. Такую ж лінію праводзіць і наш участковы інспектар Максім Ліцкевіч.

Калега Сяргея Лапукі **старшыня Ліноўскага сельскага Савета дэпутатаў Таццяна МАРДАНЬ** падкрэслівае, што зламыснікі нярэдка маскіруюцца пад гандляроў рознай прадукцыяй. «Заўсёды папярэджваю, прашу пенсіянераў, — расказвае Таццяна Мікалаеўна. — Пазваніце дзецям, папытайце, ці трэба вам набываць гэтую рэч. А то купіць непатрэбнае за вялікія грошы, потым скардзіцца, а хіба тых «прадаўцоў» знойдзеш». І яшчэ на што звярнула ўвагу Таццяна Мардань: часцей за ўсё добра праінструктаваныя дзецьмі пенсіянеры не трапляюцца на прынады махляроў. Калі маладыя прыязджаюць, прывозяць прадукты, прыбіраюць у хаце, адным словам, часта наведваюць бацькоў, апошнія адчуваюць сябе абароненымі. Яны і чужака лішні раз не пусцяць, і патэлефануюць дзецям, каб

> **“** Адзінокія, нярэдка нават пры жывых дзецях, людзі — найбольш даступная для любых нягоднікаў катэгорыя.

параіцца. А вось адзінокія, нярэдка нават пры жывых дзецях, людзі — найбольш даступная для любых нягоднікаў катэгорыя.

— Нядаўна размаўляла з такой сям'ёй, — працягвае старшыня Савета. — Старая жанчына зусім не дагледжаная, у хаце — вэрхал, сама яна не мае сілы навесці належны парадак. Пытаю ў дзяцей, чаму не глядзяць маці. А яны адказваюць, што яна іх малымі не глядзела. На жаль, і так бывае. Але ж усё роўна нельга зусім адмаўляцца ад роднага чалавека, нават калі засталіся крыўды. Не ведаю, ці будзе мець тая мая гутарка які эфект... А нядаўна мне работнікі супрацьпажарнага нагляду скардзіліся, што пажылыя людзі ў адной з вёсак не пусцілі іх у дом, не далі магчымасці праверыць стан печаў і праводкі. Гэта ўжо адваротны бок медаля, які азначае, што наша прафілактыка ды наказы дзяцей дзейнічаюць.

Наступае вясна, час нашых рэйдаў ва ўсе, нават самыя аддаленыя і маланаселеныя вёскі. Праедзем з рознымі спецыялістамі, праведаем людзей, яшчэ раз нагадаем ім аб правілах бяспекі.

**Старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў Мікалай КУДРАВЕЦ,** нядаўна абраны на гэту пасаду, сказаў, што названай тэме раённы Савет дэпутатаў мае намер удзяляць асаблівую ўвагу як на пасяджэннях сесій, прэзідыумаў Савета, так і ў паўсядзённай рабоце з кожным сельвыканкамам.

**Афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў Сяргей ДУЧЭНКА** сказаў карэспандэнту «МС», што абласное ўпраўленне плануе вясной шэраг рэйдаў у вёскі сумесна з поштай. Чаму з поштай? Таму што і махляры любяць наведваць пажылых грамадзян пасля таго, як у населены пункт паштальён прывязе пенсію. Паштальёнаў вяскоўцы ведаюць, ім давяраюць. Вось і пастараюцца разам правесці гутарку, расказаць аб формах і метадах злачыннай дзейнасці названых элементаў.

— А формы гэтыя год ад году не мяняюцца, — працягвае Сяргей Мікалаевіч. — Вось як брэсцкія махляркі не так даўно пазванілі ў кватэру па вуліцы Набярэжнай. Пенсіянеры, якая адкрыла, адрэкамендаваліся прадстаўніцамі газавай службы, сказалі, што могуць замяніць газавую пліту на новую па льготнай цане. Папрасілі заключыць дагавор, унесці папярэднюю аплату, усяго 5 рублёў. Уважліва глядзелі, куды бабуля ідзе па грошы. Потым адна запрасіла на кухню, каб удакладніць памеры пліты, яе параметры, функцыі. Пакуль абмяркоўвалі будучую пліту, другая махлярка ўкрала ўсе грошы. Пасля чаго зламысніцы ветліва развіталіся і пайшлі.

— Так што трэба зноў і зноў вучыць людзей пільнасці. Пасля рэйдаў з поштай маем намер правесці такія ж сумесныя акцыі і з аўтакрамамі спажывсаюза, — падзяліўся планамі Сяргей Дучэнка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 15 сакавіка 2018 года.**